ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. — 90 к.
3 мес. 2 р. 60 к.
6 мес. 5 р. —
12 мес. 9 р. 75 к.
Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., Іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. падатку.

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар — 10-74
Сакратар — 6-19
Партсэктар — 13-80
Сэктар інфармацыі — 13-80
Начвы рэдактар — 6-42
Галоўная кантора — 7-81
Аддзел падпіскі — 7-81
» абвестак — 7-81

АЎТОРАК, 25 сакавіка 1930 г. № 70 (3578) Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Узмацніць масавы кантроль рабочых над дзяржапаратам

З вялікай зацікаўленасьцю сачыла ўся пралетарская грамадзкасьць за новай формай удзелу рабочых мас у паляпшэньні работы нашага дзяржаўнага апарату, за ходам шэфства над Наркамфінам СССР, якое праводзілі рабочыя Маскоўскага электразаводу. Гэты вопыт быў асабліва цікавы тым, што ён, папершае, сапраўды мабілізаваў шырокія рабочыя масы, рабочых ад варштатаў, на практычную барацьбу з бюракратызмам дзяржапарату, барацьбу, якая заснавана на глыбокім вывучэньні рабочымі ад варштату ўсяе работы ўстановы і, падругое, адкрываў шырокія магчымасьці арабочаньня дзяржапарату новымі пралетарскімі кадрамі.

Гэты вопыт адразу-ж знайшоў пасьлядоўцаў. Рад прадпрыемстваў па ўсім Саюзе і ў нас, у БССР, пасьледвалі прыкладу рабочых Маскоўскага электразаводу і таксама прынялі шэфства над некаторымі ўстановамі. Але гэта ініцыятыва рабочых мас не заўсёды сустракала падтрыманьне з боку адпаведных прафэсыянальных, а дзе-ні-дзе і партыйных органаў. Таксама невыстарчальную ўвагу ўдзялілі гэтаму пытаньню органы КК-РСІ.

У сваёй пастанове, апублікаванай 16 сакавіка, ЦК і ЦКК УсеКП(б), «АДЗНАЧАЮЧЫ НЕВЫСТАРЧАЛЬНУЮ ЎВАГУ, ЯКУЮ АКАЗВАЮЦЬ ДА ГЭТАГА ЧАСУ ШЭФСКАМУ РУХУ З БОКУ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, А ТАКСАМА НЕДАСТАТКОВАЕ І НЯЎМЕЛАЕ КІРАЎНІЦТВА З БОКУ МНОГІХ МЯСЦОВЫХ ОРГАНАЎ КК-РСІ», абавязваюць «ПАРТЫЙНЫЯ КАМІТЭТЫ, ЯЧЭЙКІ ЗАВОДАЎ, ЯКІЯ ШЭФСТВУЮЦЬ, І МЯСЦОВЫЯ КК-РСІ ЎСЯМЕРНА ПАДТРЫМЛІВАЦЬ ШЭФСТВА, РАЗГЛЯДАЮЧЫ ЯГО, ЯК ВАЖНЕЙШУЮ ЧАСТКУ МАСАВАЙ РАБОТЫ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ».

І далей—«ЦК і ЦКК асобна адзначаюць, што прафсаюзы, саветы і камсамольскія арганізацыі прымаюць слабы ўдзел у справе арганізацыі і дапамогі шэфскім брыгадам».

Гэта ацэнка цалкам адбівае сапраўднае становішча з кіраўніцтвам справаю шэфства над апаратам у нас, у БССР. «Зьвязда» ўжо адзначала *) пра бязладзьдзе і блытаніну, якія існуюць у нас у пытаньнях шэфства рабочых над савецкім апаратам. Шэфствам над апаратам папрабавалі кіраваць і прафарганізацыі і непасрэдна, не праз праворганы, партарганізацыі. У выніку такой няўзгодненасьці—поўная блытаніна ў арганізацыйнай пабудове шэфства.

Адсутнасьць выразнага кіраўніцтва шэфскай работай на мясцох і арганізацыйнай устаноўкі, часам бюракратычнае ўмяшальніцтва ў жаданьне рабочых таго ці іншага прадпрыемства шэфстваваць над пэўнай установай, адмена пастаноў рабочых сходаў аб прыняцьці шэфства (і такія выпадкі былі)—вось што характарызуе становішча справы шэфства ў БССР.

Пакінутыя самім сабе, без сапраўднага практычнага кіраўніцтва, шэфы часам не разумелі ўсяго значэньня і мэты шэфства над апаратам. Рабочыя брыгады заводу «Энэргія», якія прымалі вельмі актыўны ўдзел у чыстцы апарату Наркамфіну, а таксама рабочыя гуты «Пралетары», якія ня менш актыўна ўдзельнічалі ў чыстцы Наркамюсту, зараз, пасьля чысткі, паслабілі сваю ўвагу да работы гэтых апаратаў. Нават колькасьць наведваньняў апарату рабочымі значна паменшылася. Між тым, «асноўная задача рабочага масавага кантролю зьнізу заключаецца ў тым, каб па скончэньні чысткі шэфы-заводы прымацоўвалі свае рабочыя брыгады, пад кіраўніцтвам РСІ, для ПАСТАЯННАГА, СЫСТЭМАТЫЧНАГА КАНТРОЛЮ над выкананьнем з боку асобных частак апарату падшэфнай установы важнейшых дырэктыў партыі і ўраду. Такое прымацаваньне і практычная праверка працы рабочымі брыгадамі дапамога правядзеньню выразнай клясавай лініі ў рабоце апарату, сыстэматычнага яго ачышчэньня ад нягодных і бюракратычных элемэнтаў і далейшага спрашчэньня яго работы» (з пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б). Асабліва ў двух падаваных вышэй установах—Наркамфіне і Наркамюсьце, у якіх, як вядома, чысткай, пры ўдзеле рабочых-шэфаў, выкрыта шмат фактаў ГРУБАГА СКАЖЭНЬНЯ КЛЯСАВАЙ ЛІНІІ І ПАРТЫЙНЫХ ДЫРЭКТЫЎ, важна і неабходна, каб рабочыя брыгады НЕ ПАСЛАБІЛІ СВАЙГО КАНТРОЛЮ НАД РАБОТАЙ ГЭТЫХ УСТАНОЎ. Бязумоўна, памылкай Кастрычніцкага райкому і цэнтральных праўленьняў саюзаў мэталістых і хэмікаў зьяўляецца тое, што яны якраз у такі адказны момант у справе шэфства не растлумачылі рабочым значэньня далейшай шэфскай работы і ня прынялі адпаведных мер да замацаваньня зацікаўленасьці рабочых працай даных устаноў.

У справе шэфства рабочых швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» над апаратам Наркамгандлю была дапушчана яшчэ большая памылка. Фабрычныя арганізацыі і кіраўнікі Наркамгандлю «падтрымалі» ініцыятыву швэйнікаў толькі параднымі выступленьнямі. А калі дайшло да справы, дык фабрычныя арганізацыі забылі аб сваім асноўным абавязку—дапамагаць рабочым у іх шэфскай рабоце, штодзенна іх інструктаваць, кіраўнікі-ж Наркамгандлю нават не пацікавіліся, як апарат сустрэў рабочых шэфаў. У выніку з 32-х рабочых, якія выказалі жаданьне прыняць удзел у паляпшэньні апарату Наркамгандлю, прыступіла фактычна да работы 2-3 чал., а бюракраты, якія ёсьць у Наркамгандлі, сустрэлі рабочых у штыкі. Такім чынам, у гэтым выпадку здарылася «зусім недапушчальнае зьявішча, калі шэфства зводзіцца да ўрачыстых пасяджэньняў і фармальнага падпісаньня дагавору аб шэфстве, без якой-бы там ня было практычнай работы па паляпшэньні дзяржапарату, абмяжаваўшыся нікому непатрэбнай і шкоднай параднасьцю» (з пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Мы таксама мелі выпадак жаданьня «падмены ідэі шэфства ідэяй узаемнай праверкі і ўзаемнага кантролю паміж заводамі і савецкімі ўстановамі» (з пастановы). Такое жаданьне выказаў Белдзяржгандаль, калі ён прапанаваў аднаму з цэхаў фабрыкі «Кастрычнік» заключыць дагавор на ўзаемны кантроль. Між тым, «асноўная задача шэфства заключаецца ў масавым уцягненьні рабочых брыгад у справу дзяржаўнага кіраўніцтва і кантролю зьнізу над савецкім апаратам» (з пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б). Гэты момант ня быў улічаны партыйнай часткай Белдзяржгандлю.

Усе гэтыя памылкі, якія дапушчаны нашымі арганізацыямі ў справе шэфства заводаў над установамі, кладуць на нас асаблівую адказнасьць за далейшы пасьпяховы ход шэфства рабочых над дзяржапаратам і недапушчэньне далейшых скажэньняў партыйных дырэктыў.

Штодзеннае кіраўніцтва шэфствам над дзяржапаратам пастановаю ЦК і ЦКК УсеКП(б) УСКЛАДЗЕНА НА ОРГАНЫ КК-РСІ.

Трэба ЗНАЧНА ЎЗМАЦНІЦЬ ПРАЦУ ПА КІРАЎНІЦТВЕ І ПРАКТЫЧНЫМ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНІ ШЭФСТВА РАБОЧЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ НАД УСТАНОВАМІ.

Гэта—адна з важнейшых чарговых задач партыйных і прафэсыянальных арганізацый.

*) Гл. «Зьвязду» № 67.

АРГАНІЗАВАЦЬ СЯЎБУ

На мясцох пры правядзеньні калектывізацыі і мерапрыемстваў па ліквідацыі кулацтва, як клясы, у раёнах суцэльнай калектывізацыі быў дапушчаны рад скрыўленьняў партыйнай лініі, якія выявіліся ў парушэньні асноўнага прынцыпу, па якім набудавана наша калектывізацыя—прынцыпу добраахвотнага аб'яднаньня; пераскокваньне праз асноўную форму калгаснага аб'яднаньня на даным этапе—арцель проста да камуны; у недаацэнцы, а часамі і ў ігнараваньні асаблівасьцяй асобных нацыянальных раёнаў і фактах націску на серадняка, у прыватнасьці, пры правядзеньні мерапрыемстваў па ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Кулак цалкам і поўнасьцю выкарыстаў дапушчаныя памылкі ў інтарэсах барацьбы з савецкай уладай. Усюды дзе ён толькі меў на тое найменшую магчымасьць, кулак папрабаваў злосьліва маляваць перад бядняцка-серадняцкімі масамі перагібы і скрыўленьні лініі партыі. Таму барацьбу з перагібамі кулак стараўся тлумачыць, як адмаўленьне ад калектывізацыі, а галавацяпы разглядаюць барацьбу са скажэньнямі, як «адступленьне партыі», як «ход назад». Такімі мэтадамі кулак прабаваў атрымаць давер'е бядняцка-серадняцкіх мас і выклікаць рух на выхаду з калгасаў, а галавацяпы—апраўдаць сваю памылку.

Які палітычны вывад павінны зрабіць нашы арганізацыі з гэтага факту? Ліквідаваць скрыўленьні і даць зьнішчальны адпор спробам кулака зноў стаць на ногі. Раздушыць гэтыя спробы самым бязьлітасным чынам. Работа па ліквідацыі кулацтва, як клясы, у раёнах суцэльнай калектывізацыі павінна быць даведзена да канца. Найменшыя спробы антысавецкай палітычнай актыўнасьці кулацтва па-за раёнамі суцэльнай калектывізацыі трэба хутка і рашуча спыніць у корані.

Трэба ўмацніць арганізаваную актыўнасьць батрацтва і беднаты—нашай асноўнай апоры ў вёсцы. Трэба перш за ўсё ўмацніць батрацка-бядняцкае ядро ў калгасах.

Трэба ўзмацніць работу сярод жанчын—бядначак і серадначак як па-за калгасам, так і, у асаблівасьці, у калгасах. Практыка яшчэ і яшчэ раз даводзіць, што жанчыны—серадначкі і бядначкі з прычыны свае малое сьвядомасьці лягчэй за ўсё паддаюцца кулацкай агітацыі, асабліва, калі яна спакулюе на дробна-ўласьніцкіх і рэлігійных забабонах. Трэба рашуча змагацца з тэндэнцыямі, накіраванымі на адхіленьне серадняка ад удзелу ў кіраўніцтве калгасаў. Нельга забываць, што саюз беднаты і серадняком супроць кулацтва зьяўляецца асновай калгаснага руху ў даны момант.

Трэба ўмацаваць і ўзмацніць партыйную арганізацыю ў вёсцы за лік с.-г. рабочых, батрацтва і лепшых калгасьнікаў, якія паказалі сваю адданасьць партыі і выстарчальную палітычную стойкасьць у барацьбе з кулаком.

Пасеўная кампанія абарачаецца зараз у рашаючую арэну нашай барацьбы з клясавым ворагам. Кулак імкнецца ня толькі сарваць калгаснае будаўніцтва. Яго асноўная мэта зараз—сарваць пасеўную кампанію. Сваёй агітацыяй ён імкнецца забіць усякую актыўнасьць і самадзейнасьць калгасьнікаў, прышчапляючы ім утрыманскія настроі («Калі прышлі ў калгас—дзяржава павінна вам даць усё»). Сярод індывідуальнікаў ён вядзе агітацыю, якая штурхае іх да максымальнага скарачэньня пасеўнае плошчы.

Пасьпяховае правядзеньне пасеўнае кампаніі як па калгасным, так і па індывідуальным сэктары, выкананьне і перавыкананьне вызначаных намі пасеўных пляноў нямысьлімы без перамогі адчаянага супраціўленьня кулака, бяз зьнішчальнага адпору яго спробам сарваць і дэзарганізаваць нашу пасеўную кампанію. Адсюль задача: зьнішчыць спробы кулацтва перашкодзіць сяўбе.

Але з гэтым зьвязана таксама рашучая перамога тае фактычнае агентуры кулака ў партыйнай арганізацыі і ў савецкім апараце, якою зьяўляюцца праваапартуністычныя элемэнты. Дзе-ні-дзе гэтыя элемэнты ўсьлед за кулаком паднялі галаву і прабуюць разам з ім тлумачыць скрыўленьні і перагібы, як партыйную лінію, супроць якой яны-ж «сваячасова папярэджвалі». Па такога роду спробах правых апартуністых спэкуляваць на асобных памылках і прыпісваць іх да генэральнай лініі партыі, трэба бязьлітасна ўдарыць, бо яны граюць на руку клясаваму ворагу.

Зноў і зноў правыя апартуністыя аб'ектыўна робяцца саюзьнікамі кулакоў. І барацьба за правядзеньне бальшавіцкае сяўбы, за замацаваньне дасягнутых вынікаў калектывізацыі, якія павінны забясьпечыць далейшы рух наперад, будзе аб'ектыўна зьвязана не толькі з перамогай і ліквідацыяй супраціўленьня кулака, але і з перамогай праваапартуністычнай агентуры ў яго партыйных радох.

Гэта, зразумела, не выключае, а мае на мэце рашучую барацьбу з «лева» апартуністычнымі настроямі, галоўнай формаю якіх зьяўляецца недаацэнка серадняка, схільнасьць да чыноўніцкіх мэтадаў калектывізацыі і «преклонение» перад скрыўленьнямі партлініі.

«Левыя» апартуністыя прабуюць штурхаць партыю на барацьбу з серадняком, як гэта ў свой час рабілі троцкістыя. Правыя апартуністыя прабуюць зноў штурхаць партыю да адступленьня перад кулаком. І тыя і другія вольна ці нявольна дапамагаюць кулаку. Таму партыя вядзе бязьлітасную барацьбу з тымі і другімі.

(«ПРАВДА»).

Пашырэньне пасеўнае плошчы на 12 проц.—адна з асноўных задач веснавой кампаніі

Арганізаваць рашучы адпор кулацкай агітацыі за скарачэньне яравога кліна! Дабіцца павялічэньня пасеваў у калгасах і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках!

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПАШЫРЭНЬНЕ ЗАСЕЎНАЙ ПЛОШЧЫ ў індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках

Праз 2-3 дні ў паўднёвых раёнах БССР пачынаюцца палявыя работы. Максымум праз 7-10 дзён яны разгорнуцца ва ўсіх акругах. Каля 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак яшчэ не ўвайшлі ў калгасы.

Ці падрыхтаваны індывідуальны сэктар да веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі, ці забясьпечана выкананьне дырэктывы аб пашырэньні засеўнае плошчы і аб ажыцьцяўленьні агрыкультурных мерапрыемстваў. Аб гэтым ніхто з тых, каму «трэба ведаць», ня ведае, дасюль гэтым ня цікавіўся.

Аднак, весткі, якія паступаюць з раду акруг і раёнаў, гавораць, што становішча вельмі сур'ёзнае. Асабліва пагражаючая справа з падрыхтоўкай індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у тых мясцох, дзе былі дапушчаны перагібы пры калектывізацыі, дзе гэтыя перагібы ўсё яшчэ не выпраўляюцца. У такіх раёнах няма належнай падрыхтоўкі да сяўбы і з боку калгасаў. Кулак, зразумела, не бяз посьпеху, выкарыстоўвае бязьдзейнасьць мясцовых арганізацый, якія ў некаторых мясцох нават тармозяць выкананьне дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб неадкладным выпраўленьні дапушчаных скрыўленьняў. У гэтых мясцох ня толькі не замацоўваюцца посьпехі калектывізацыі, ня толькі не забясьпечана пашырэньне засеўнае плошчы калгасамі, але ствараецца і сур'ёзная пагроза зьмяншэньня засеўнае плошчы індывідуальнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі. Напрыклад, у некаторых раёнах Аршанскай і Магілеўскай акруг, у выніку ўзмацніўшайся агітацыі кулака, пры бязьдзейнасьці мясцовых арганізацый, сярод некаторых індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак пашыраны чыста спажывецкія тэндэнцыі. Гэта значыць, што ёсьць намер апрацаваць ня ўсю сваю засеўную плошчу, а засеяць толькі палову або 1 гэктар бульбаю, каб было чым пракарміцца, а пасьля ўвайсьці ў калгас голенькім.

Рамонт плугоў у калгасе імя Будзённага (Заслаўскі р-н).

Амаль ва ўсіх акругах адзначаюцца выпадкі паяўнага скрыўленьня дырэктыў СНК і НКЗ БССР аб зямлянадзяленьні індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія не ўвайшлі ў арганізаваныя ў данай мясцовасьці калгасы. Паводле гэтых пастаноў такім індывідуальным гаспадаркам выдзяляецца спэцыяльны яравы клін, выходзячы з фактычнага зямлякарыстаньня. Замест таго, каб шляхам належнай растлумачальнай работы, на падставе цьвёрдай добраахвотнасьці імкнуцца ўпэўніць гэтыя індывідуальныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі не разьбіваць свой клін на асобныя палосы, а апрацаваць іх у грамадзкім парадку, ёсьць спробы ажыцьцявіць гэта шляхам націску. А загадчык Бабруйскага акрза, у гутарцы, надрукаванай у бабруйскім «Камунісьце», проста рэкамендуе выкарыстоўваць для гэтай мэты і «арганізацыйную работу». Ня цяжка сабе ўявіць як на мясцох будзе ажыцьцёўлена такая дырэктыва загадчыка акрза.

Да апошняга часу ні ў аднэй акрузе не разгорнута яшчэ папулярызацыя новага закону аб сельска-гаспадарчым падатку і аб ільготах, якія ён дае індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам за пашырэньне засеўнай плошчы, за ажыцьцяўленьне агрыкультурных мерапрыемстваў. Сельсаветы, якія павінны давесьці плян сяўбы да асобнага індывідуальнага двара і наглядаць за выкананьнем гэтага пляну, як правіла, яшчэ нічога ня робяць у гэтай галіне.

У выніку—у індывідуальным сэктары надзвычайна слаба ідзе ачыстка насеньня і, нават, гной ня ўсюды вывозіцца на поле. Не рамантуецца інвэнтар, бо камітэты ўзаемадапамогі ня выканалі і 50 проц. пляну арганізацыі кузьняў.

Індывідуальныя бядняцкія гаспадаркі не забясьпечаны працоўнаю дапамогаю. Замест 823 рабочых дружын камітэтамі ўзаемадапамогі арганізаваны толькі 373.

Яшчэ ня высьветлена таксама, колькі ў індывідуальных бядняцкіх гаспадарках ня хопіць насеньня і адкуль узяць яго.

Неабходны рашучы пералом у адносінах удзяленьня належнай увагі падрыхтоўцы да сяўбы ў індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках як з боку мясцовых, так і цэнтральных арганізацый.

В.

Арганізацыя насеньняводзтва ў калгасах зрываецца

Насеньняводная справа ў спэцыяльна вылучаных для гэтае мэты калгасах, здавалася, павінна была прыцягнуць да сябе ўвагу ўсяе нашае грамадзкасьці і, у першую чаргу, Наркамзему, Белкалгасцэнтру і інш.

На справе, аднак, атрымаўся зусім іншы малюнак. Паасобнымі арганізацыямі, замест дапамогі праяўляюцца недапушчальныя галавацяпскія адносіны, якія мяжуюцца са злачынствам. Белсельтрэст, напрыклад, да апошняга часу марудзіў з палачай нарадаў на атрыманьне гатунковага насеньня з саўгасаў. Зараз нарады пад прымусам РСІ даны. Аднак, саўгасы на мясцох адмаўляюцца ад выдачы вызначанай колькасьці насеньня.

З Бабруйску паведамляюць, што гатунковы ячмень, вызначаны да перадачы насеньняводным калгасам, скарыстан на бровары. Такія-ж трывожныя весткі аб адмаўленьні выдаць гатунковае насеньне саўгасамі атрыманы і з Гомеля.

Дзяржнасенфонд, які больш ад іншых устаноў павінен быць зацікаўлен у разьвіцьці насеньняводзтва, абмяжоўвае сваю дапамогу патрабаваньнем вестак ад Паляводсаюзу, рэгулярна накіроўваючы копіі сваіх патрабаваньняў НК-РСІ. Пры вызначэньні адпускных цэн на гатунковае насеньне, якое перадаецца саўгасамі, наперакор існуючых інструкцый Наркамгандлю СССР, Дзяржнасенфонд склаў такую калькуляцыю, пры якой гэтае насеньне даражэй ад завознага. У выніку—насеньняводныя калгасы, атрымліваючыя гатунковае насеньне ў абмен на звычайнае, павінны яшчэ даплачваць каля 4 руб. 50 кап. на цэнтнэр. Гэта, зразумела, ні ў якім выпадку ня спрые разьвіцьцю гатунковага насеньняводзтва ў калгасах.

Саюзхлеб, праз які завозіцца гатунковы авёс з-за межаў БССР, падыйшоў да справы з чыста камэрцыйнага пункту погляду. Да гэтага часу ён не падаў дакумантаў, якія сьведчаць якасьць завознага гатунковага насеньня. Між тым, гэтыя дакуманты павінны былі ісьці з кожным вагонам.

Белкалгасцэнтр адмовіўся ад арганізацыі насеньняводзтва ў агракамбінатах. Ён распыліў данае заданьне па паасобных раёнах, а адносна Рагачэўска-Жлобінскага камбінату Белкалгасцэнтр дзесяткі раз мяняў устаноўку. Такім чынам да сёняшняга дня пытаньне адносна насеньняводзтва ў агракамбінатах і ня вырашана.

Сыстэма Белкалгаспаляводсаюзу, якая непасрэдна праводзіць насеньняводную справу ў калгасах, не аддае належнай увагі гэтай справе і, спасылаючыся на тыя цяжкасьці, якія здараюцца ў працы, ня выказвае патрэбнай рашучасьці. Паляводсыстэма не прыцягнула да справы неабходных спэцыялістых, без якіх немагчыма правядзеньне гэтай высока-агрыкультурнай работы. Не ва ўсіх акругах вылучаны насеньняводныя калгасы.

Недапушчальныя адносіны да насеньняводнае справы праяўляюць Меншчына і Гомельшчына, якія да гэтага часу нічога не зрабілі па вылучэньні насеньняводных гаспадарак, гаворачы, што стварэньне буйных насеньняводных гаспадарак высунута, дзякуючы невуцтву цэнтральных працаўнікоў.

Трэба ўрэшце палажыць канец галавацяпству, якое зрывае арганізацыю ўласнага насеньняводзтва.

А. Д.

393 ДВАРЫ ЎСТУПІЛІ Ў КАМУНУ ІМЯ БВА

Першай у БССР чырвонаармейскай камуне імя БВА пакуль толькі 8 месяцаў. Але і за гэты кароткі тэрмін камуна пасьпела паказаць сапраўды бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнай будоўлі. На роўнай палянцы расчышчанага бору ўжо стаяць чатыры вялізарныя жыллёвыя дамы, акружаныя: хлявом, пральняю, баняй, хлебапякарняй, сталоўкаю. Тут-жа працуе цыркулярка і паравы млын. А вясною на 1.000 гект. культурнай пахаці загудзе 15 трактароў.

Зараз камуна рыхтуецца да сяўбы. Камунары кучкамі і паадным рассыпаліся на дзесяткі вёрст. Пракладваюцца новыя дарогі, будуюцца масты, сячэцца лес. Апрача сяўбы, штодзенна трэба абслужыць да 100 сьвіней, 40 коняй, 300 кароў. Камунараў-жа ўсяго 167 чал. Увосень прыбудзе яшчэ 200 чалавек. Трэба і да іх прыезду падрыхтаваць кватэру. Работы шмат, але яна не палохае.

Ноччу на 5 сакавіка ў камуне выбухнуў пажар. Раптам загарэўся хлеў. У гэты час якраз у камуне адбываўся сход, на якім абмяркоўвалася пытаньне аб арганізацыі супроцьпажарных мер. Як толькі пачуўся крык дзяжурнага: «гарым», усе камунары кінуліся да хлява. Ня было нават багроў і тапароў. Праз 15 мінут выбралі ўсю ваду са студняў. Не хапіла вады. Аднак, камунары перамаглі стыхію. У выніку самаадданай працы і гэраічных намаганьняў, ня маючы ніякіх супроцьпажарных прылад, камунары пагасілі пажар.

Ня ўсё ўдалося выратаваць. Кулакі аблілі бэнзынаю хлеў з усіх бакоў, і ён згарэў дашчэнту. Загінула 20 лепшых малочных кароў і лепшы вытворца.

Вестка аб пажары хутка абляцела суседнія хутары і вёскі. Беднякі і сераднякі групамі прыходзілі на пажарышча. Многія з іх раней ніколі ня былі ў камуне і зараз, упяршыню, знаёміліся з яе становішчам, з яе людзьмі. Ім ня верылася, каб на балоце можна было стварыць такую гаспадарку.

У адказ на кулацкі падпал, пасьля азнаямленьня з гаспадаркай, 393 двары вакольных вёсак уступілі ў камуну.

Неабходна адзначыць, што кааперацыя ігнаруе абслугоўваньне камунараў. Яшчэ ў кастрычніку мінулага году Белкаапсаюз запрапанаваў Бабруйскаму акрсаюзу тэрмінова заняцца арганізацыяй абслугоўваньня спажывецкіх і культурна-бытавых патрэб камунараў. Тады-ж Бабруйскаму акрсаюзу з гэтай мэтай было выдана 5.000 руб., а Любанскаму раённаму спажывецкаму саюзу запрапанавана абсталяваць у камуне краму, арганізаваць грамадзкае харчаваньне і г. д. Але кааперацыя ня выканала сваіх абавязкаў, а абмяжавалася толькі «кааперацыйным прывітаньнем».

Па тавары і прадукты прыходзіцца езьдзіць у спажывецкую краму аж за 23 кілёмэтры. І нават, пры гэтых умовах ніякай дапамогі камуне ня робіцца. Камунары не заўсёды могуць купіць тое, што ім жыцьцёва патрэбна. Ва ўмовах камуны, напрыклад, вялікае значэньне набывае абутак, які хутка рвецца, калі працуеш на балоце. Крама-ж не клапоціцца, аднак, забесьпячэньнем камунараў абуткам і наогул тымі таварамі, якія патрэбны камунарам. Адзінае, аб чым паклапацілася кааперацыя, гэта аб поўным зборы паёў з камунараў. Такія-ж адносіны кааперацыі наглядаюцца і да рабочых саўгасу імя Х-годзьдзя.

Зараз вызначаецца некаторы зрух. Ужо ёсьць дагаворанасьць аб стварэньні ўласнага спажывецкага т-ва ў камуне, але трэба, каб кааперацыя ўжо хутчэй пачала працаваць як належыць.

С. УСЕВІЧ.

КАМЕНСКАЯ ПАПЯРОВАЯ Ф-КА ПРАПАНУЕ

АРГАНІЗАВАЦЬ ПРАВЕРКУ ВЫНІКАЎ САЦСПАБОРНІЦТВА

Рабочыя БССР прымуць выклік Каменкі—ініцыятара сацспаборніцтва

КАМЕНСКАЯ папяровая фабрыка пазаўчора на старонках газэты «ПРАВДА» зьвярнулася з адозвай да ўсіх рабочых Савецкага Саюзу.

Гэта фабрыка першай узьняла сьцяг сацыялістычнага спаборніцтва і выклікала рад прадпрыемстваў Савецкага Саюзу.

Увесь час Каменская фабрыка высока трымала гэты сьцяг і з гонарам выконвала ўзятыя на сябе абавязкі.

У сваёй адозьве рабочыя Каменкі падводзяць вынікі сацыялістычнага спаборніцтва, якое пачалося год таму назад.

— Праграма 1928-29 году перавыканана на 9,1 проц. па выпрацоўцы паперы, на 11,8 проц.—па выпрацоўцы картону і на 12,5 проц. па цэлюлёзе. Фабрыка павінна была, паводле пляну, зьнізіць сабекошт аднае тоны паперы да 319,03 кап., сабекошт зьніжаны да 293,63 кап. Плян патрабаваў зьніжэньня сабекошту картону да 160 руб. 05 кап. за тону, сабекошт зьніжаны да 105 руб. 35 кап.

За першы квартал гэтага году фабрыка перавыканала павялічаны плян выпуску паперы на 1,5 проц. У студзені плян выпрацоўкі паперы перавышаны на 5 проц., картону — на 2,8 проц., цэлюлёзы—на 4,8 проц. Люты даў яшчэ большае перавыкананьне праграмы.

Гэтых вялікіх дасягненьняў Каменка дабілася, ня гледзячы на зношанасьць абсталяваньня, дзякуючы вялікаму вытворчаму энтузіязму рабочых мас і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу.

Увесь калектыў фабрыкі прымае актыўны ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве; прамфінплян даведзены да асобных ударных брыгад, асобных рабочых; 70 проц. рабочых прымаюць удзел ва ўдарных брыгадах.

Зараз Каменская папяровая фабрыка занесена на чырвоную дошку «Саюзпапера» і ЦК рабочых папяровай прамысловасьці прэміруюць фабрыку за перавыкананьне прамфінпляну.

Рабочыя Каменскае фабрыкі ў сваёй адозьве прапануюць арганізаваць у гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва праверку вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва, вынікаў работы ўдарных брыгад. У гадавіну сац. спаборніцтва павінна ўзьняцца новая хваля актыўнасьці рабочых мас для далейшай барацьбы за перавышэньне прамфінпляну, за сацыялістычную рэканструкцыю. Гэта будзе лепшым адказам на «крыжовы паход», на … каньне апартуністых і прымірэнцаў.

Рабочыя БССР падхопяць заклік Каменскай фабрыкі—ініцыятара сацыялістычнага спаборніцтва.

На прадпрыемствах трэба будзе арганізаваць праверку вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва, якая ўзьніме новую хвалю актыўнасьці рабочых мас, якая дасьць новыя посьпехі ў барацьбе за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, у барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю.

Фашыстыя дамагаюцца разрыву з СССР

ПАРЫЖ, 23. Былы французскі пасол у царскай Расіі Нулянс, выступаючы з дакладам аб франка-савецкіх дачыненьнях у «дыплёматычнай акадэміі» заявіў, што савецкі ўрад ня выканаў умоў, узятых на сябе ў момант прызнаньня Францыяй, а іменна ўпарадкаваньня даўгоў і іншых прэтэнзій, а таксама адмовы ад прапаганды, а з гэтае прычыны прызнаньне павінна лічыцца аўтаматычна ануляваным.

Пасланьнік Грэнар, які ўдзельнічаў пры Эрыё ў распрацоўцы прызнаньня СССР, заявіў аб сваёй поўнай салідарнасьці з Нулянсам. Блізкая да паліцыі газэта «Лібэртэ» карыстаецца выпадкам для новых выпадаў і патрабуе неадкладнага разрыву зносін з СССР.

* *

Выступленьне былога французскага пасла ў царскай Расіі Нулянса аб тым, што нібы савецкі ўрад ня выканаў умоў узятых на сябе ў момант прызнаньня СССР Францыяй, а таксама заява пасланьніка Грэнара, які нібы прысутнічаў пры распрацоўцы гэтага прызнаньня—зьяўляецца чысьцейшым паклёпам і правакацыяй з боку гэтых прадстаўнікоў французскага фашызму. Адносна савецкай прапаганды, якую міжнародныя драпежнікі бачаць нават і ва сне, дык французскім фашыстым трэба было-б лепш памаўчаць, асабліва зараз.

У сучасны момант, калі так ганебна праваліласяя гісторыя з «прапажаю» белагвардзейца Куцепава, калі канчаткова праваліласяя кампанія крыжовага паходу на СССР,—фашысцкая рэакцыя не супакойваецца. Яна шукае новых прычын і прычэпак, шляхам правакацыі будзе імкнуцца дабіцца свайго—разрыву з Савецкім Саюзам з тым, каб прысьпешыць вайну з нянавіснаю ім першаю пралетарскаю дзяржаваю, якая так пасьпяхова будуе сацыялізм.

Вось што азначае выступленьне Нулянса з абвінавачаньнем Савецкага Саюзу ў нявыкананьні ўзятых на сябе абавязацельстваў.

Няўдалая спроба замаху белагвардзейца на т. Доўгалеўскага

ПАРЫЖ, 24. Сёньня пры выхадзе з памяшканьня паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР на савецкага грамадзяніна …, які знаходзіўся ў навуковай камандыроўцы, т. Гершэльмана быў утвораны замах.

Нейкі белагвардзеец Мікаў накінуўся на т. Гершэльмана з каменем. Прамахнуўшыся Мікаў хацеў зьбіць кулакамі. Падышоўшы вартавы паліцыянт адвёў белагвардзейца ў …, апошні заявіў, ШТО ЁН МЕЎ НАМЕР ЗАБІЦЬ ПАЎПРЭДА СССР У ПАРЫЖЫ ТАВ. ДОЎГАЛЕЎСКАГА.

ЗМОВА НЯМЕЦКАЙ РЭАКЦЫІ СУПРОЦЬ СССР

БЭРЛІН, 23. «Ротэ Фанэ» агалашае поўны сьпіс прамоўцаў, якія выступалі на сакрэтнай антысавецкай нарадзе ў бэрлінскім «арыстакратычным клюбе». Апроч тых, пра якіх паведамлялася, выступілі былы нямецкі міністар Кейдэль, былы міністар Раумэр, лідэр нацыяналістых граф Вэстарп, граф Кайзэрлінг, белагвардзейскі прафэсар Ільлін і іншыя. На нарадзе быў таксама зачытаны ліст былога маскоўскага карэспан. «Бэрлінэр Тагэблят» Пауля Шэфэра.

Мільёны рабочых гатовы абараняць СССР

ПРАДСТАЎНІКУ ЎсеЦСПС НЯМЕЦКІ ЎРАД АДМОВІЎ У ВІЗЕ

БЭРЛІН, 22. У Эсэне (Нямеччына) адкрыўся другі міжнародны зьезд прадстаўнікоў таварыстваў прыяцеляў СССР. На зьезьдзе прысутнічаюць прадстаўнікі Францыі, Англіі, Амэрыкі, Нямеччыны, Бэльгіі, Нарвэгіі, Даніі, Польшчы, Румыніі і іншых краёў.

Напярэдадні адкрыцьця канфэрэнцыі адбыўся мітынг. У ім прынялі ўдзел тысячы рабочых, якія рашуча заявілі аб сваёй цьвёрдай волі абараняць СССР ад нападу імпэрыялістых.

Другі міжнародны зьезд прыяцеляў СССР адчыніўся прамоваю Мюнцэнбэрга, які паведаміў, што нямецкі ўрад ня даў дазволу на прыезд у Нямеччыну прадстаўніку ЎсеЦСПС Яўрэінаву. Паведамленьне было спаткана выгукамі пратэсту па адрасу нямецкага ўраду.

Па прапанове ангельскай дэлегацыі Яўрэінаў дэманстрацыйна абран у прэзыдыум зьезду.

Выступіўшы з дакладам аб становішчы СССР на першым годзе пяцігодкі, прадстаўнік нямецкага саюзу прыяцеляў СССР Альбрэхт паказаў на бурны рост сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР. Калі быў складзены пяцігадовы плян,—заначыў дакладчык,—дык Каўцкі назваў яго фантастычным, няўхільна выклікаючым банкроцтва. Працоўныя СССР адказалі на гэтае прароцтва рашэньнем выканаць пяцігодку за 4 гады. Саюз прыяцеляў СССР павінен распаўсюджваць правільныя весткі аб сацыялістычным будаўніцтве СССР, штодзённа растлумачваць працоўным масам сапраўдны сэнс антысавецкай кампаніі царкоўнікаў, сацыял-фашыстаў і буржуазіі ўсіх краін.

27 сакавіка склікаецца

ПЛЕНУМ ЦК КП(б)Б

з наступнай абвесткай дня:

1. Аб ходзе калектывізацыі і падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі.
2. Аб ходзе выкананьня прамфінпляну.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.

Працэс „СВУ“

Контр-рэвалюцыйная літаратурная група яфрэмаўцаў

Пасяджэньне 19-га сакавіка скончылася допытам падсуднага Матушэўскага. Абвінавачаны да 1925-26 г. быў членам кіруючай пяцёркі СУМ, якая ўлілася ў СВУ.

Матушэўскі прызнае, што ён разам з Паўлушкавым быў адным з арганізатараў СУМ. Разам з Паўлушкавым ён выпрацаваў праграму гэтае арганізацыі, зацьвярджаў яе плятформу, у прыватнасьці пункт аб тэроры. Ён пацьвярджае, што СУМ быў тэрарыстычнай арганізацыяй, якая мела на мэце ажыцьцяўляць тэрарыстычныя акты супроць выдатных дзеячоў партыі і савецкай улады.

Матушэўскі заяўляе, што ён раней лічыў Пятлюру нацыянальным гэроем, які змагаўся за вызваленьне Украіны. Разам з Паўлушкавым ён прымаў удзел у арганізацыі паніхіды па Пятлюры.

На пытаньне грамадзкага абвінаваўцы т. Любчанкі, Матушэўскі, як і Паўлушкаў, адказвае, што ў СВУ пайшлі «толькі адзінкі з інтэлігенцыі і кулакоў».

На пытаньне свайго абаронцы, Матушэўскі адказвае, што ён асуджае сваю мінулую дзейнасьць.

20 сакавіка Вярхоўны суд дапытаў падсуднага Іўчанку — украінскага пісьменьніка, члена СВУ. Іўчанка — тыпічны буржуазны інтэлігент, былы эсэр, а ў апошні час член антысавецкае контррэвалюцыйнае арганізацыі.

Падсудны прызнае, што літаратурны гурток Старыцкай-Чарняхоўскай прадстаўляў сабою арганізаванае таварыства, якое ставіла сабе задачай усялякімі спосабамі весьці контр-рэвалюцыйную агітацыю.

На пытаньне тав. Любчанкі Іўчанка катэгарычна адказвае, што ў сваіх …рах ён адбіваў настроі буржуазіі.

Потым суд дапытаў абвінавачанага Маргуліса. Ён член СВУ, член кіеўскай калегіі абаронцаў, былы член украінскае партыі сацыял-фэдэралістых і былы намесьнік губэрскага камісара Цэнтральнай Радзе.

Маргуліс паказвае: «Асабіста мне ня была патрэбна, бо ў Савецкай … іне я ня ведаў гора. Але справа ў тым, што ў мяне засталіся старыя перажыткі, старая закваска, і да гэтага-ж я падтрымліваў знаёмства са старымі антысавецкімі коламі. Таму я апынуўся на лаўцы падсудных».

Папраўка

У № 68 «Зьвязды» ад 23 сакавіка … пастанове прэзыдыуму ЦВК СССР аб … хіленьні парушэньняў выбарчага … надаўства Саюзу ССР, у § 6 надрукавана: «Вытлумачыць, што мерапрыемствы савецкага ўраду, накіраваныя да абмяжаваньня кулацкіх гаспадарак у … або да ліквідацыі кулацтва ў раёнах суцэльнае калектывізацыі, не распаўсюджваюцца на асоб. пазбаўленых выбарчых праў з прычыны іх прыналежнасьці да кулацкіх гаспадарак», а трэба чытаць:

«Вытлумачыць, што мерапрыемствы савецкага ўраду, накіраваныя да абмяжаваньня кулацкіх гаспадарак у … або да ліквідацыі кулацтва ў раёнах суцэльнае калектывізацыі, не распаўсюджваюцца на асоб, пазбаўленых выбарчых праў не паводле адзнакі прыналежнасьці іх да кулацкай гаспадаркі».

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

МАСАВАЯ СЯЎБА НА УКРАІНЕ

Веснавая сяўба распачалася ўжо ва многіх акругах Украіны. Кожны дзень наступаюць весткі аб тым, што масавая сяўба разгортваецца. У паўднёвых раёнах Украіных ўжо канчаецца сяўба раньніх культур. З Хэрсонскае акругі паведамляюць, што там у радзе раёнаў сяўба раньніх культур ужо скончылася. У акрузе ўжо засеяна 100.000 гэкт. У працягу 5 дзён сяўба будзе скончана па ўсёй акрузе.

Аб пачатку сяўбы паведамляюць з Сталінскае акругі. **Калгасьнікі выяжджаюць у поле з музыкай і чырвонымі сьцягамі.**

З Шаўчэнскай акругі наступілі трывожныя весткі аб падрыхтоўцы да сяўбы. У некаторых сёлах акругі яшчэ ня поўнасьцю сабраны пасеўны матар'ял і ня ўсе калгасы забясьпечаны с.-г. машынамі.

У Сьвятураўскім і Голапрыстанскім раёнах, на Хэрсоншчыне, масавая сяўба распачалася яшчэ 11 сакавіка. Аднак, арганізацыйная падрыхтоўка на мясцох далёка не забясьпечвае нармальнага і своечасовага правядзеньня сяўбы. Многія калектывы выйшлі ў поле, ня маючы пэўнай пляпавай арганізацыі рабочай сілы, цьвёрдай расстаноўкі яе на паасобных вучастках работ. У гэтых раёнах аграпэрсанал зусім **недапушчальна адносіцца да свае справы**, фактычна нічым не дапамагае калгасам у арганізацыі іх работ. У раёнах ёсьць рад калектываў, дзе аграномы за ўвесь час падрыхтоўкі да веснавой сяўбе ні разу яшчэ ня былі. У самыя адказныя дні пачатку масавай сяўбы пераважная большасьць аграпэрсаналу Галапрыстанскага раёну **сядзела ў сваіх канцылярыях, пісала ведамасьці і г. д.**

Амаль усюды на Украіне зямельныя арганізацыі вельмі няўважліва адносяцца да забесьпячэньня сяўбы ў індывідуальных гаспадарках. Наркамзем запрапанаваў усім земаддзелам неадкладна ўжыць рашучыя меры ў гэтым напрамку.

Агляд падрыхтаванасьці да сяўбы

КУРСК. У акрузе пачаўся агляд гатоўнасьці калгасаў і саўгасаў да сяўбы. У некаторых калгасах і саўгасах выкрыта абсалютнае нежаданьне ўзмацніць работу па падрыхтоўцы да сяўбы. Інвэнтар да гэтага часу не адрамантаваны, машыны ляжаць пад сьнегам, рабочая сіла не падрыхтавана.

Аб індывідуальных гаспадарках забылі

НОЎГАРАД. Захапіўшыся калектывізацыяй, у акрузе зусім забылі аб падрыхтоўцы да сяўбы індывідуальных гаспадарак. Задачы пасаўкампаніі на сельскіх сходах не абгаворваліся, вытворчыя нарады не працавалі. Пасевы індывідуальных гаспадарак закантрактаваны на 43 проц. Ачыстка насеўнага насеньня выканана толькі на 47 проц. Броньніцкі раён ачысьціў усяго 7 проц. насеньня.

„Культурная палоска"

САЦСПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ КАЛГАСАМІ САМАРСКАЙ АКРУГІ

САМАРА. Паміж калгасамі Самарскай акругі разгарнулася сацспаборніцтва па падрыхтоўцы да засеву звыш пляну «культурнай палоскі». Гэтымі палоскамі па акрузе мяркуецца ахапіць 15.000 гэкт. Увесь ураджай з іх пойдзе на ўзмацненьне культурнай работы ў калгасах і ў фонд трактарызацыі краю.

АДКРЫЦЬЦЁ НОВАГА КАНАЛУ

ТЫФЛІС, 23. У Кахэціі адкрыты канал, які абводніць 10.000 гэкт. зямлі.

Дрэнна арганізавана грамадзкае харчаваньне

РАСТОЎ на ДОНЕ. Наступіўшыя ў паўночнай і ўсходняй частках краю замаразкі затрымліваюць палявыя работы. Цёплае і зусім спрыяючае для сяўбы надвор'е стаіць у Майкопскай і Кубанскай акругах.

КРАСНАДАР. Масавая сяўба ідзе па ўсёй Кубані. Ужо засеяна 52.000 гэктараў—10 проц. пляну. Першым скончыў сяўбу калгас «Новае», **які засеяў 120 проц. пляну.** Скончылі сяўбу і збожжавыя калгасы Цукратрэсту ў Карапоўскім раёне.

СТ. ЦЯМІЖБЭКСКАЯ. Харчаваньне калгасьнікаў на палёх не наладжана. Украінская машына-трактарная станцыя не дае на палі гарачае стравы. Няма чайнікаў, нават дроў, няма гарачай вады. Толькі на Эйскай станцыі каапэратыў наладзіў дастаўку прадуктаў на поле і гатаваньне стравы.

Адсутнасьць стравы паніжае дысцыпліну на палявых работах.

РАМОНТ ДРАПАНА

ПЛЯН КАНТРАКТАЦЫІ ЦУКРОВЫХ БУРАКОЎ ВЫКАНАН З ПЕРАВЫШЭНЬНЕМ

МАСКВА, 23. Плян кантрактацыі цукровых буракоў у бягучым годзе перавысіў наметкі пяцігадовага пляну: 820 тыс. гэкт. замест 723 тым.

НК-РСІ у дакладной запісцы Саўнаркому СССР заяўляе аб неабходнасьці фарсаваць вытворчасьць буракоў і прапануе давесьці пасеўную плошчу да канца пяцігодкі да 1.675 тыс. гэкт. замест 1.163 тысяч. Спэцыяльныя аграмерапрыемствы павінны ўзьняць ураджайнасьць буракоў на 50 проц. Ужо ў гэтым годзе будзе прыступлена да арганізацыі 3-х магутных цукровых саўгаса-калгаскіх камбінатаў на Украіне і ЦЧО. НК-РСІ прапануе таксама стварыць рад новых цукрова-прамысловых тэхнікумаў і факультэтаў.

Вялікія вытворчыя посьпехі Егарлыкскае МТС

ЕГАРЛЫК (Донская акруга), 24. Егарлыкская МТС у Армавірскай акрузе дабілася вялікіх вытворчых посьпехаў. За 4 дні пры дапамозе 52 трактароў станіца заарала 1.000 гэкт. і 1.000 гэкт. засеяла. Перавышэньне пляну збору насеннага фонду, моцная дысцыплінаванасьць калгасьнікаў і добры падбор брыгадзіраў-палыводаў забясьпечваю поўнае выкананьне пасеўнага пляну. Калгасьнікі пад кіраўніцтвам праўленьняў калектываў і адміністрацыі МТС давялі сваё ўменьне працаваць з энтузіязмам. Ня гледзячы на выключна моцныя халодныя ветры, якія дасягаюць 20 мэтраў у сэкунду, работы ў полі ідуць бяз значных перабояў. Замест прынятага на Паўночным Каўказе дзяленьня калектываў на 50-підворкі, Егарлыцкая МТС практыкуе падзел калгасаў на пастаянныя брыгады, якія адказваюць за выкананьне ўсіх веснавых пасеўных работ. Склад брыгад зьмяняецца толькі ў залежнасьці ад сяўбы коласавых і тэхнічных культур. Гэтакая сыстэма забясьпечвае спэцыялізацыю калгасьнікаў і бесьперабойны выхад у поле.

Праэкт асноўных палажэньняў новай пазыкі „пяцігодка—ў чатыры гады"

МАСКВА, 21. Пашыранае пасяджэньне ЦК дапамогі дзяржкрэдыту і ашчаднай справе пры прэзыдыуме ЦВК СССР сумесна з прадстаўнікамі саюзных рэспублік і камісіі дапамогі буйнейшых фабрык і заводаў Масквы зацьвердзіла праэкт асноўных палажэньняў новае пазыкі «Пяцігодка—ў чатыры гады», **якая павінна быць выпушчана да 1-га жніўня гэтага году.** Праэкт прадугледжвае, што новая пазыка павінна мець **процантныя і бяспроцантныя выпускі.** Па процантнай пазыцы належыць устанавіць 8 проц. гадавых і 2 проц. на выйгрышы.

Па бяспроцантнай пазыцы увесь прыбытак, у размеры 10 проц., трэба выкарыстаць на выйгрышы, прычым **гэты выпуск пазыкі павінен быць бяспройгрышным, г. зн. на працягу тэрміну пазыкі кожная аблігацыя павінна выйграць.** Пазыка выпускаецца тэрмінам на 10 год. Размер выйгрышаў вызначаецца — ад 50 да 1.000 руб. Колькасьць тыражоў трэба ўстанавіць ня менш за 6 у год.

Шырэй разгарнуць кампанію

МАСКВА. НКФін СССР тав. **Н. П. Бруханаў** паслаў усім фінансавым органам СССР наступную тэлеграму: Агітацыйна-растлумачальная кампанія па с.-г. падатку разгортваецца недапушчальна слаба. У прыватнасьці, недастаткова растлумачваюцца ільготы гаспадаркам, якія пашыраюць пасеўную плошчу. Неадкладна разгарнеце агітацыйна-растлумачальную кампанію, шырока паведамеце ўсе калектыўныя гаспадаркі і індывідуальныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі аб тым, што ўвесь прырост пасеўных плошчаў як мінулага, так і 1930 г. у параўнаньні з плошчамі, улічанымі пры абкладаньні ў 1928-29 г., аслабаняецца зусім ад абкладаньня с.-г. падаткам. Таксама растлумачце, што ад абкладаньня аслабаняюцца пасевы на цэлінных і залежных землях, пасевы цукравых буракоў, кармавых траў і корапьлодаў.

ПЕРАВЫБАРЫ ПАРТОРГАНАЎ

Сваячасова і рашуча выправіўшы хібы ў падрыхтоўцы, правядзем перавыбары на аснове лініі партыі

„СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ ПАВІННА БЫЦЬ ВЫКАРЫСТАНА ДЛЯ ТАГО, КАБ ДАБІЦЦА НОВАГА ЎЗДЫМУ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ, ДЛЯ ПАГАЛОЎНАГА ЎЦЯГНЕНЬНЯ КАМУНІСТЫХ ВА ЎДАРНЫЯ БРЫГАДЫ, ДЛЯ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ПАСЬПЯХОВАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ" (З ЛІСТА ЦК КП(б)Б).

СВАЯЧАСОВА ВЫПРАВІЦЬ

Па Беларусі разгарнулася справаздачна-перавыбарчая кампанія парторганаў.

Ня трэба паўтараць аб усёй палітычнай важнасьці і значэньні перавыбараў партыйных органаў. Дырэктыўны ліст ЦК КП(б)Б зусім ясна і выразна падкрэсьліў тыя вялікія задачы, якія стаяць перад кожнай партарганізацыяй у правядзеньні перавыбараў партыйных органаў.

Між тым, у радзе партыйных ячэек мы маем ня толькі ігнараваньне задач і дырэктыў, на аснове якіх павінны быць праведзены перавыбары, але і просты зрыў справаздачна-перавыбарчых сходаў.

Гэта тлумачыцца выключна адсутнасьцю адпаведнай падрыхтоўчай работы ў гэтых арганізацыях, тым, што ня была сканцэнтравана ўвага членаў партыі і рабочых мас наўкола задач справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Чым іншым, як ня поўнай адсутнасьцю падрыхтоўчай работы тлумачыцца зрыў перавыбарчых сходаў на заводзе **«Камунар»**, у ячэйцы **праўгасу** БДУ і г. д.

Так праходзяць перавыбары і на радзе іншых заводаў і фабрык. Зразумела, што пры такой недапушчальна слабой падрыхтоўцы, пры адсутнасьці мабілізацыі ўвагі партыйных і беспартыйных мас асноўныя задачы справаздачна-перавыбарчай кампаніі ня будуць ажыцьцёўлены. Трэба карэнным чынам узмацніць шырокую арганізатарскую і растлумачальную работу наўкола справаздачна-перавыбарчай кампаніі, трэба мабілізаваць думку партыйных мас і беспартыйных рабочых і работніц наўкола перавыбараў партыйных органаў. Толькі пры гэтай умове справаздачна-перавыбарчая кампанія пройдзе ў поўнай адпаведнасьці з задачамі, паказанымі ў дырэктыўным лісьце ЦК КП(б)Б. Толькі пры гэтай умове справаздачна-перавыбарчая кампанія зьявіцца генэральным аглядам усяе работы партарганізацыі.

Нарэшце, мы павінны з усёй рашучасьцю падкрэсьліць недапушчальнасьць правядзеньня перавыбараў па сьпісах без забесьпячэньня шырокага пэрсанальнага галасаваньня, што мае месца ў асобных ячэйках. Карэспандэнцыя з **Койданаўскага** раёну сыгналізуе аб тым, што ўрокі Кастрычніцкага РК дзе-ні-дзе яшчэ ня ўлічаны. Дырэктыва ЦК партыі аб тым, каб правесьці справаздачна-перавыбарчую кампанію пры строгім захаваньні ўнутрыпартыйнай дэмакратыі на аснове разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі — павінна быць коўнасьцю выканана. Па тых, хто скажае гэту дырэктыву, трэба жорстка ўдарыць.

Перавыбары павінны прайсьці пад знакам генэральнай праверкі ўсяе работы партарганізацыі. Кожны партколектыў на прадпрыемстве ў часе перавыбараў павінен глыбока завастрыць сваю ўвагу на пытаньнях барацьбы за прамфінплян, павінен праверыць партыйнае кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарным рухам. Гэта можна зрабіць толькі пры ўмове шырокага разгортваньня самакрытыкі, пры ўмове мабілізацыі думкі партыйных мас і беспартыйных рабочых і работніц наўкола задач справаздачна-перавыбарчай кампаніі, толькі на аснове поўнага выкананьня дырэктыў, паказаных у лісьце Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б.

С. Б—н.

БЮРО НЯ КІРУЕ УДАРНІКАМІ

Бюро парт'ячэйкі фабрыкі **«Беларуска»** (Менск) не правяло падрыхтоўчай работы да перавыбараў. На цэхах ня былі праведзены гутаркі аб значэньні перавыбараў. Маўчала і фабрычная насьценгазэта. Рэдкалегія толькі ў самы апошні дзень зьмясьціла заметку аб перавыбарах бюро.

Ня дзіва, што на перавыбарчым сходзе амаль ня было беспартыйных рабочых. Нават далёка ня ўсе члены ячэйкі зьявіліся на перавыбарчы сход.

Спрэчкі паказалі, што ў рабоце ячэйкі ёсьць ня мала недахопаў. Ячэйка дапусьціла зрыў прамфінпляну на фабрыцы. Толькі тады, калі стала вядомым, што фабрыка ў першым квартале выканала прамфінплян толькі на 50 проц., бюро ячэйкі ўзварушылася. Была праведзена растлумачальная работа. Партыйная ячэйка здолела мабілізаваць рабочую масу на ліквідацыю прарыву. Вынікі ў наяўнасьці. За першую дэкаду сакавіка «Беларуска» выканала прамфінплян на 108 проц. Але нельга сказаць, што бюро ячэйкі добра кіруе ўдарнымі брыгадамі. Пастаяннага кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарнымі брыгадамі няма. Гэта зьяўляецца аднэй з асноўных прычын зрыву прамфінпляну ў першым квартале. Яшчэ і зараз частка партыйцаў імкнецца ўнікнуць уступленьня ў ударныя брыгады. Камуністы Мінчанка, напрыклад, на прапанову ўступіць на ўдарную брыгаду адказаў:

— Ня трэба. Я і так буду працаваць.

Партработа на прадпрыемстве не перабудавана. На фабрыцы працуе некалькі соцень рабочых і работніц. Прынята-ж у партыю за апошні час толькі 6 чалавек.

Новае бюро павінна ўлічыць гэтыя недахопы.

М. Цырлін.

ЯК НЯ ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ

Выкананьне прамфінпляну зьяўляецца асноўным паказальнікам работы парткалектываў на прадпрыемствах. У гэтым напрамку работа партколектываў запалкавых фабрык **«Чырвоная Бярэзіна»** і **«Пралетарская Перамога»** паказальная, як узор таго, **як ня трэба працаваць.**

Партколектыў налічвае ў сваіх радох 250 членаў і кандыдатаў партыі пры наяўнасьці на фабрыках 2.016 рабочых і работніц. Правільная расстаноўка партыйных сіл і рашучая арганізацыйная перабудова партработы пад лёзунгам павароту «тварам да вытворчасьці», бясспрэчна, забясьпечылі-б поўнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Што-ж мы маем на «Чырвонай Бярэзіне» і «Пралетарскай Перамозе»? Пачнем з вытворчых паказальнікаў. На фабрыках у **трывожным** становішчы знаходзіцца **выкананьне** прамфінпляну. Ні «Чырвоная Бярэзіна», ні «Пралетарская Перамога» ў першым квартале ня выканалі прамфінпляну. Другі квартал таксама ня прынёс ніякіх зьмен. У студзені «Чырвоная Бярэзіна» выканала прамфінплян на 90,65 проц.; у лютым—89,41; за першую дэкаду сакавіка — 92,61. «Пралетарская Перамога» за першую дэкаду сакавіка выканала прамфінплян толькі на 63,25 проц.

Заданьне на павялічэньні прадукцыйнасьці працы выканана **толькі** на 90 проц. Зусім **дрэнная** справа са зьніжэньнем сабекошту. Паводле пляну адна скрыня запалак павінна каштаваць фабрыкам 3 руб. 82 кап. На справе-ж сабекошт дасягае 4 руб. 15,5 кап. Затое рост зарплаты значна павысіўся супроць пляпавых меркаваньняў. Працоўная дысцыпліна на фабрыках **слабая.** Мае месца **рост** прагулаў.

Гэтыя факты сьведчаць аб сур'ёзных вытворчых прарывах на прадпрыемствах. Як-жа партколектыў выпраўляе гэтыя прарывы?

Кіраўнікі на «Чырвонай Бярэзіне» — народ спакойны. Аб прарыве першага кварталу загаварылі толькі ў лютым. Фабрычная газэта **«Чырвоны Бярэзінец»** у нумары ад 17-га лютага зьмяшчае рэзалюцыі бюро калектыву аб прарыве: «Лепш позна, чым ніколі». Такая пастанова зьяўляецца характэрнай для кіраўніцтва партыйнага калектыву «Чырвонай Бярэзіны».

Пасьля пастановы бюро партколектыву аб практычных мерах па выпраўленьні прарываў першага кварталу, ніхто нават не падумаў праверыць, як выконваецца гэта пастанова. Як і раней, гэта пастанова зьявілася аднэй з чарговых «очковтирательских» пастаноў. Кіраўнікі правялі мітынг, пашумелі, далі некалькі ўрачыстых абяцаньняў выправіць прарыў і... ўсё.

На справе-ж партыкіраўніцтва «Чырвонай Бярэзіны» **нічога** не зрабіла, каб мабілізаваць усе фабрычныя арганізацыі і рабочую масу на ліквідацыю прарыву.

Цэхавыя парт'ячэйкі стаяць у баку. Большасьць цэхпрафбюро працуе слаба. Вытворчыя нарады ня зьбіраюцца. Ударныя брыгады працуюць без усялякага кіраўніцтва. Бюро калектыву ўхваліла арганізаваць курсы для кіраўнікоў ударных брыгад. Аднак, пастанова бюро засталася на паперы.

Асобныя заг. цэхамі цягнуцца ў хвасьце і прымірэнча адносяцца да парушальнікаў працдысцыпліны.

Як рэагуе на гэта бюро партколектыву, як яно перабудоўвае работу? Сыстэма партработы зусім не перабудавана, сетка зьменных ячэек не адпавядае ўмовам вытворчасьці, асабліва з пераходам на бесьперапынку. За апошні час ячэйкі ў арганізацыйных адносінах зусім распаліся. У большасьці ячэек няма ні бюро, ні сакратароў. Партарганізатары брыгад лічацца на паперы. Фактычна сяк-так працуе толькі бюро партколектыву, або правільней — адзін сакратар бюро. Па сутнасьці гэта зьяўляецца грубай недаацэнкай сіл нізавога актыву. Як вынік, мы маем вялікую дэзарганізаванасьць ва ўсёй рабоце прадпрыемства і хранічны прарыў у выкананьні прамфінпляну.

Перабудова прафсаюзнай работы агідна зацягваецца. Увесь час фабрычны камітэт працаваў зусім дрэнна. Нарэшце, мы павінны спыніцца на б. дырэктару фабрыкі тав. **Міхейчыку,** які зьяўляўся членам бюро партыйнага калектыву. Гэта ён займаўся сыстэматычным «очковтирательством», запэўняючы трэст, што «прамфінплян будзе выканан». Між іншым, тав. Міхейчыка ніхто з работы **ня зьняў.** Трэст проста перакінуў яго на работу ў **Рэчыцу.**

З гэтых фактаў мы павінны зрабіць некалькі вывадаў. Перавыбары бюро партыйнага калектыву і цэхавых ячэек павінны быць поўнасьцю скарыстаны для рашучай безадкладнай перабудовы ўсёй сыстэмы партыйнай, прафсаюзнай і гаспадарчай работы на прадпрыемстве.

У часе перавыбараў трэба вылучыць новы актыў, які здолее выканаць пастаўленыя перад ім задачы і выправіць допушчаныя прарывы і памылкі. Задача вылучэньня і падрыхтоўкі нізавога партыйнага актыву — асноўная задача. Партыйны калектыў павінен навесьці рашучую барацьбу супроць таварышоў, якія недаацэньваюць сіл нізавога актыву. Райком партыі, які да гэтага часу слаба кіраваў партколектывам, павінен максымальна ўзмацніць сваё кіраўніцтва. Справаздачна - перавыбарчая кампанія парторганаў на «Чырвонай Бярэзіне» павінна ўнесьці глыбокі і рашучы **пералом** ва ўсю партработу, павінна быць скарыстана для разгортваньня сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за **выкананьне і перавыкананьне** прамфінпляну.

І. Б.

Выбары па сьпісах

Грубае парушэньне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі

Нядаўна **Менскі** АК КП(б)Б рашуча асудзіў грубую палітычную памылку бюро **Кастрычніцкага** райкому партыі пры правядзеньні справаздачна - перавыбарчай кампаніі парторганаў Кастрычніцкай арганізацыі. Бюро Кастрычніцкага РК не правяло патрэбнай падрыхтоўчай работы і падыйшло да правядзеньня перавыбараў апаратным парадкам. Бюро не дало цьвёрдых выразных дырэктыў партыйным ячэйкам на аснове дырэктыўнага лісту ЦК КП(б)Б. У выніку асобныя ячэйкі, наперакор дырэктыве ЦК і Менскага АК, праводзілі закрытыя сходы. Сакратар РК тав. Дзічкоўскі ў ячэйцы галоўных майстэрань станцыі Менск груба парушыў унутрыпартыйную дэмакратыю, склаўшы папярэдні сьпіс кандыдатаў у новы склад бюро.

Пастанова Менскага акругкому партыі зьявілася папярэджаньнем аб недапушчальнасьці паўтарэньня такіх палітычных памылак. На жаль, памылкі Кастрычніцкага РК ня ўсюды ўлічаны. Прыкладна такія-ж факты мы заўважаем і ў Койданаўскай раённай арганізацыі.

Койданаўская партарганізацыя прыступіла да перавыбараў у дакладна вызначаны тэрмін. Але падрыхтоўка да справаздачна - перавыбарчай кампаніі была праведзена фармальна. Райком абмежаваўся тым што вылучыў сваіх прадстаўнікоў на справаздачна - перавыбарчыя сходы ячэек. Некаторыя з вылучаных таварышоў зусім ня былі знаёмы з дырэктывамі ЦК і АК КП(б)Б і таму дапусьцілі ня мала «отсебятины». Факты:

Прадстаўнік райкому тав. **Дыснэр** у ячэйцы камуны **«Чырвоны Сьцяг»** склікаў пасяджэньне бюро, на якім стаў складаць сьпіс кандыдатур. Тав. Дыснэр не абмежаваўся толькі тым, што склаў сьпіс членаў і кандыдатаў у новы склад бюро ячэйкі. Ён яшчэ пачаў складаць сьпіс дэлегатаў ад ячэйкі на раённую партканфэрэнцыю. Складзеныя сьпісы былі афіцыйна зацьверджаны. Пры гэтым у пастанове бюро дакладна паказана, хто павінен быць членам або кандыдатам бюро і хто пасылаецца на канфэрэнцыю з правам пастаноўчага і дарадчага голасу.

Відавочна, што гэта зьяўляецца грубым парушэньнем унутрыпартыйнай дэмакратыі. Бюро ячэйкі камуны «Чырвоны Сьцяг» разам з прадстаўніком райкому парушылі дырэктыву ЦК, дзе зусім ясна і выразна сказана:

«Перавыбары праводзіць пры самым строгім захаваньні ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, пры самым шырокім абгаварэньні паасобных кандыдатур з забесьпячэньнем пэрсанальнага (а не па сьпісах) галасаваньня».

Я. І—н.

Да дывізійных партканфэрэнцый

У Беларускай вайсковай акрузе пачынаюцца дывізійныя партыйныя канфэрэнцыі.

Партарганізацыі часьцей акругі прыходзяць да гэтых канфэрэнцый, як здаровыя, ідэалёгічна ўстойлівыя атрады нашай партыі, загартаваныя ў тэй рашучай барацьбе з праяўленьнямі правага ўхілу і «левымі» загібамі як у тэорыі, так і на практыцы, якую вялі яны на працягу гэтага пэрыяду.

Цяпер, калі партыя і рабочая кляса вырашаюць карэнныя задачы сацыялістычнага будаўніцтва, вядуць рашаючы бой з рэшткамі капіталізму ў нашай краіне, — работа партарганізацый акругі набывае вялікае значэньне.

Генэральная лінія на замацаваньне дасягнутых посьпехаў у калектывізацыі сельскае гаспадаркі, на далейшае разгортваньне суцэльнай калектывізацыі і на базе яе ліквідацыя кулацтва, як клясы, рашучая барацьба з усімі скрыўленьнямі лініі партыі ў калгасным руху — павінна быць усьвядомлена і практычна праламляцца ў жыцьцё кожнай партарганізацыяй, кожным партыйцам з тым, каб праводзіць правільную лінію партыі, не дапускаць скрыўленьняў у яе правядзеньні, выхоўваючы чырвонаармейскую масу, як актыўных удзельнікаў, арганізатараў і кіраўнікоў сацыялістычнай гаспадаркі на сяле.

Бажнейшая задача дывізійных партыйных канфэрэнцый — гэта **павярнуць дывізійныя партыйныя арганізацыі больш тварам да пытаньняў баявой падрыхтоўкі.**

У гэтай галіне перад партыйнымі арганізацыямі непачаты край работы.

Хутка пачынаецца летні пэрыяд — важнейшы этап баявой падрыхтоўкі, калі праходзіцца галоўнейшы разьдзел ваеннага навучаньня, які канчаецца манэўрамі.

У гэты пэрыяд праводзіцца прызыў повабранцаў тэрытарыяльных часьцей, зборы пераменнага складу, і нашы партарганізацыі павінны перанесьці на баявую падрыхтоўку тыя выразныя мэтады работы, якія даюць нам найбольшыя вынікі з тым, каб ахапіць усю чырвонаармейскую масу баявой вучобай і палітычным выхаваньнем і дабіцца істотных вынікаў па аўладаньні ваеннай справай.

Дывізійныя партыйныя канфэрэнцыі павінны да пытаньня ўзьняцьця баявой падрыхтоўкі **прыкаваць** увагу кожнай партыйнай арганізацыі і кожнага камуністага.

Бальшавіцкае выхаваньне камсамольцаў у гэты адказны пераломны момант мае вялізарнае значэньне і канфэрэнцыі павінны праверыць, наколькі выконваецца партыйнымі арганізацыямі апошняя дырэктыва ПУР аб партыйным кіраўніцтве камсамолам.

Удзел у баявой падрыхтоўцы — галоўнейшая задача камсамолу. Камсамольцы павінны быць на чале ўдарніцтва ў арміі. Партыйныя ячэйкі павінны сур'ёзна заняцца баявым выхаваньнем камсамольцаў, скарыстоўваючы іх парыў і энтузіязм у спалучэньні з усваеньнем ваенна-тэхнічных і ваенна-тактычных ведаў.

Праверка выкананьня пастаноў партыі аб Чырвонай арміі і дырэктыў Рэўваенсавету Саюзу, узмацненьне тэмпу і якасьці кіраўніцтва партыйнай работы — вось галоўныя пытаньні, міма якіх ня могуць прайсьці дывізійныя канфэрэнцыі.

На канфэрэнцыі трэба шырока прыцягнуць прадстаўнікоў сутаварыскіх партыйных ячэек, у якасьці гасьцей прыцягваючы іх да самой работы канфэрэнцыі. Трэба скарыстаць іх для яшчэ большага ўзмацненьня сувязі паміж часьцямі, сутаварыскімі ячэйкамі і прадпрыемствамі, якія шэфствуюць, з тым, каб перад тварам усё ўзрастаючай ваеннай пагрозы цясьней згуртаваць часьці акругі з пралетарскімі масамі.

Няхай дывізійныя партыйныя канфэрэнцыі Беларускае ваеннае акругі яшчэ цясьней згуртуюць бальшавікоў акругі наўкола генэральнае лініі партыі, наўкола Ленінскага Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б).

М.

Рэзалюцыі пашыранага прэзыдыуму ВККІ

Па справаздачным дакладзе ЦК УсеКП(б) тав. МОЛАТАВА

Прэзыдыум ВККІ, заслухаўшы даклад тав. Молатава аб становішчы ў СССР, адзначае, як найвялікшую перамогу сусьветнага пралетарыяту, вялізарныя новыя посьпехі сацыялістычнага наступленьня пралетарыяту СССР на чале з яго авангардам — УсеКП(б).

Ужо Х пленум ВККІ, адзначаючы бурны рост сацыялістычнай індустрыі і магутны ўздым энтузіязму пралетарыяту, будуючага сацыялізм, падкрэсьліў, што пяцігадовы плян сац. будаўніцтва зьяўляецца найвялікшым дасягненьнем ня толькі працоўных мас СССР, але і ўсяго міжнароднага пралетарыяту. Вынікі першага году пяцігодкі сьведчаць ня толькі аб выкананьні вызначанага пляну, але і аб стварэньні прадпасылак да яго перавыкананьня. Тэмп росту прадукцыі прамысловасьці ўсё ўзьнімаецца, значна перавышаючы меркаваньні другога году пяцігодкі. Павышаецца прадукцыйнасьць працы і пры гэтым забясьпечваюцца значна лепшыя тэхнічныя ўмовы для далейшых посьпехаў у гэтай галіне. Рост укладаньняў у капітальнае будаўніцтва ў першым годзе пяцігодкі перавысіў у паўтара разы плянавыя меркаваньні. Узмоцнена прасоўваецца наперад цяжкая індустрыя, тэмп росту якое значна вышэй сярэдніх паказальнікаў па прамысловасьці. У той-жа час нават у галіне тавараразвароту адбыўся буйнейшы зрух у бок сацыялізацыі (93 проц. усяго тавараразвароту ўжо ахвачана дзяржаўна - кааперацыйнымі органамі). Адначасова, ня гледзячы на ўсе спэцыфічныя труднасьці сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, адзначаецца далейшы колькасны рост рабочае клясы, рост заработнае платы, перавод значнай часткі прамысловых прадпрыемстваў на сямігадзінны рабочы дзень і на бесьперапынку, скарачэньне беспрацоўя, бязупынны рост культурнага і бытавога абслугоўваньня шырокіх рабочых мас.

Самым выдатным посьпехам апошняга году зьяўляецца рост масавага калгаснага руху, які ахапіў цэлыя вялікія раёны і ўжо цяпер уцягнуў у будаўніцтва буйных калектываў каля паловы індывідуальных дробных сялянскіх гаспадарак.

Прэзыдыум ВККІ бачыць вялізарную перамогу сацыялістычнага наступленьня ў тым,што ўжо ў бліжэйшы час больш паловы ўсяго таварнага збожжа дзяржава здолее атрымаць з рук калгасаў і саўгасаў, што ня можа ня стаць паваротным пунктам ва ўсіх суаднасінах клясавых сіл як у нутры краю, так і ў галіне ме міжнародных адносін.

Бурнае разьвіцьцё калгасаў вырашае цяжэйшую праблему дыктатуры пралетарыяту — праблему ўцягненьня ў арбіту сацыялістычнай рэвалюцыі мільёнаў індывідуальных сялянскіх гаспадарак. Гэты бурны рух, які зьмятае на сваім шляху ўсе перашкоды, перакульвае ўсе буржуазныя і рэфармісцкія тэорыі аб эканамічнай «устойлівасьці» і «выгоднасьці» дробнае індывідуальнае сялянскае гаспадаркі параўнальна з буйной. Гэты масавы рух назаўсёды хавае пазычаную трацкізмам меншавіцкую канцэпцыю аб антырэвалюцыйнасьці ўсяго сялянства і аб нядольнасьці пралетарыяту весьці за сабой па шляху да сацыялізму асноўныя масы вёскі. Гэты рух у корані падрывае важнейшае палажэньне правых апартуністых, нібы палітыка калектывізацыі пагражае разрывам змычкі рабочае клясы з сялянствам і багата такімі вынікамі, як зрыў збожжазагатовак і скарачэньне засеўных плошчаў.

Посьпех масавага калгаснага руху, які робіць магчымай замену капіталістычнай гаспадаркі (кулацкай) буйной калектыўнай гаспадаркай, ставіць у парадак дня перад пралетарскай дыктатурай задачу ліквідацыі кулацтва, як клясы. Паколькі кулацтва ўнутры СССР зьяўляецца тэй клясай, якая да апошняга часу захоўвала капіталістычную вытворчую базу, ажыцьцяўленьне палітыкі ліквідацыі гэтае клясы спрыяе павароту бядняцкіх і серадняцкіх мас у бок сацыялізму і разам з тым вырывае ў сусьветнай буржуазіі адну з важнейшых яе пазыцый, пазбаўляючы яе ўнутры СССР падтрыманьня кулацкай контррэвалюцыі. Тым самым кожны пасьпяховы крок калгаснага руху становіцца новай вехай па шляху да перамогі сусьветнага Кастрычніка. Пасьпяховае разьвіцьцё калгаснага руху ня можа ня стаць баявым заклікам сусьветнаму пралетарыяту і прыгнечаным сялянскім масам усіх краёў да барацьбы за сусьветную дыктатуру пралетарыяту.

Прэзыдыум ВККІ бачыць верную заруку перамогі сацыялізму ў тым, што калгасны рух зьяўляецца сапраўдным рухам мільёнаў бядняцкіх і серадняцкіх мас, перад якімі 12 год бясприкладнай барацьбы на чале з пралетарыятам і яго партыяй адкрылі найшырэйшыя гарызонты. З барацьбой за калгасы шырокія масы вёскі зьвязваюць поўны разрыў з цяжкім мінулым на падставе вялізарнага культурнага ўздыму і карэннае зьмены ва ўсім укладзе жыцьця сялянскіх мас. Арганізаваны ўдзел у калгасным руху гэтых мас пры забесьпячэньні прынцыпу добраахвотнасьці паскарае працэс згуртаванасьці асноўных мас вёскі з індустрыяльным пралетарыятам, падводзячы пад змычку пралетарыяту з сялянствам магутнейшую вытворчую базу і вядучы тым самым да зьнішчэньня процілегласьці паміж горадам і вёскай.

Рост кіраўнічага ўплыву пралетарскага гораду ў адносінах вёскі, якая ламае ўсе старыя падпоры, набывае тым большае значэньне, што пасьпяховае сацыялістычнае наступленьне зрабілася крыніцаю новага магутнага ўздыму актыўнасьці і творчасьці пралетарыяту СССР — носьбіта дыктатуры і гегемона сацыялістычнай рэвалюцыі.

Моцна ўзросшая актыўнасьць рабочых мас выяўляецца ў росьце працоўнага энтузіязму, у стварэньні новых мэтадаў сацыялістычнага будаўніцтва, у магутным руху да новых форм арганізацыі сваёй актыўнасьці, у руху ўдарнікаў і сацыялістычным спаборніцтве, у мабілізацыі рабочых брыгад на дапамогу калгасам, у актыўнай барацьбе за аўладаньне навукай і тэхнікай, ва ўзрастаючай інтэрнацыянальнай акцыі.

Самым яскравым выяўленьнем узрастаючай палітычнай актыўнасьці рабочае клясы зьяўляецца выключны тэмп росту камуністычнай партыі, у рады якое імкнуцца рабочыя цэлымі цэхамі.

Гэта ўзрастаючае з кожным днём давер'е шырокіх мас да ленінскай партыі зьяўляецца простым адказам на яе правільнае кіраўніцтва. Шырокія масы ўсё больш усьведамляюць, што рашаючыя посьпехі на сацыялістычным фронце непарыўна зьвязаны з правільнай партыйнай лініяй, нічога агульнага ня маючай ні з антыленінскай лініяй забяганьня наперад і захапленьня адміністрацыйнымі мэтадамі (што характарызавала лінію трацкістых, а потым лінію зіноўеўскай апазыцыі), ні з антыленінскай палітыкай неабмежаваных уступак капіталістычным элемэнтам, курс на якую трымалі прыхільнікі бухарынскай тэорыі «ўрастаньня кулака ў сацыялізм».

УсеКП(б) цьвёрда праводзіць сваю лінію ў цяжэйшых умовах, калі сацыялістычнае наступленьне натыкаецца на жорсткае супраціўленьне ўсіх антыпралетарскіх, антысацыялістычных контррэвалюцыйных сіл унутры краю і за мяжой. Камуністычны Інтэрнацыянал, адзначаючы безнадзейнасьць спроб клясавых ворагаў сарваць справу сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, вітае рэвалюцыйную барацьбу УсеКП(б) і савецкай улады супроць кулакоў, супроць шкоднікаў і сабатажнікаў, супроць усіх агентаў сусьветнай контр - рэвалюцыі. Прэзыдыум ВККІ заяўляе, што барацьба ЎсеКП(б) супроць гэтых ворагаў зьяўляецца справаю ўсяго Камуністычнага Інтэрнацыяналу і што гэта барацьба павінна праводзіцца самым пасьлядоўным і бязьлітасным спосабам.

Прэзыдыум ВККІ ўпэўнены ў тым, што правільнае кіраўніцтва рабочай клясай і мабілізацыя ўсіх творчых сіл, патрэбных для поўнай перамогі над труднасьцямі, будуць у далейшым тым лепш забясьпечаны, чым больш пасьлядоўна ЎсеКП(б) будзе і далей весьці непрымірымую барацьбу супроць усякіх хістаньняў і ваганьняў, за выразную клясавую лінію. Усе сэкцыі Камінтэрну павінны аўладаць незаменным вопытам УсеКП(б), моцнай сваім ленінскім майстэрствам кіраўніцтва масамі, бальшавіцкай стойкасьцю ў барацьбе са скрыўленьнямі партыйнай лініі, сыстэматычнай праверкай партыйных радоў і самай цеснай згуртаванасьцю партыі з пралетарскімі масамі на базе шырока разгорнутай самакрытыкі.

Прэзыдыум ВККІ ад імя сэкцый Камінтэрну, вітаючы ленінскае кіраўніцтва ЎсеКП(б), заяўляе аб поўным безагаворачным падтрыманьні з боку ўсяго Камінтэрну непрымірымай барацьбы ЎсеКП(б) і яе ЦК за прынцыпы ленінізму, за ленінскую лінію партыі, за поўнае перамаганьне правага ўхілу і прымірэнцтва і супроць усякіх праяў левага фразэрства, якое зьяўляецца адрыжкай дробна-буржуазнай гістэрычнай дэмагогіі трацкізму, які цяпер канчаткова выявіў сваю контр - рэвалюцыйнуюіснасьць.

Прэзыдыум ВККІ яшчэ раз пацьвярджае вялізарнае значэньне барацьбы з ухіламі ўнутры ЎсеКП(б) для ўсіх сэкцый Камінтэрну і з радасьцю канстатуе кансалідацыю ЎсеКП(б) на базе адзіна правільнай ленінскай лініі і разгрому ўсіх элемэнтаў і плыняй, якія паграшалі паслабленьнем баявой вдольнасьці партыі.

Посьпехі пяцігодкі і асабліва сацыялістычнае ператварэньне вёскі зьяўляюцца сапраўднай прычынай росту агрэсыўнасьці імпэрыялізму супроць СССР.

Імпэрыялізм, які задыхаецца ў ціскох невырашальных супярэчнасьцяй, паглыбленых крызісам у Злучаных Штатах Паўночнай Амэрыкі, бясьсільны папярэдзіць пашырэньне гэтага крызісу на рад іншых капіталістычных краёў, ня можа ня бачыць у пасьпяховым ажыцьцяўленьні вялікага пляну пяцігодкі пагібелі яго ўласных плянаў. Посьпехі пяцігодкі, умацоўваючы пазыцыі пралетарскай дыктатуры і сацыялізму, надрываюць усе пляны буржуазіі, разьлічаныя на перамаганьне савецкай улады мерамі эканамічнага націску. Плян Юнга, які зьяўляецца плянам грабежніцтва на карысьць імпэрыялістых (перш за ўсё на карысьць ПАЗШ) за лік пралетарскіх і поўпралетарскіх мас Эўропы, і асабліва Нямеччыны, накіраваны сваім лёзам супроць СССР.

Тым больш умацаваньне сацыялістычных пазыцый забясьпечвае няўхільнае павышэньне матар'яльнага і культурнага ўзроўню працоўных СССР, чым з большым посьпехам у самым працэсе сацыялістычнага росту вырашаецца праблема беспрацоўя, тым трудней праграмы весьці імпэрыялізму важнейшыя пункты яго праграмы — пераложэньне ўсяго цяжару крызісу на плечы працоўных мас капіталістычных і каланіяльных краёў шляхам новага націску рацыяналізацыі, новых масавых звальненьняў рабочых, новых падаткаў. Прадстаўляючы з сябе рэзкі кантраст з загніваючым сьветам капіталізму, край, дзе будуецца сацыялізм, больш чым калі-б там ні было прыцягвае да сябе ўзрокі працоўных і прыгнечаных усіх краёў, як найвялікшая апора ў іх змаганьні за сваё разьняволеньне, паскараючы з кожным днём працэс расхістваньня капіталістычнай стабілізацыі.

Усе правакацыі супроць СССР, уся сьвістапляска узьнятая супроць краю пралетарскай дыктатуры буржуазіяй і яе зброяносцамі — сацыял - фашыстымі ў саюзе з папай рымскім і ўсімі чорнымі сіламі старога сьвету, зьяўляюцца нічым іншым, як заклікам да абароны кулака і паходам супроць міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі, у першую чаргу паходам супроць апоры гэтай рэвалюцыі — СССР.

Ударная задача імпэрыялістых у цяперашні час — усімі мерамі перашкодзіць далейшаму прасоўваньню наперад сацыялістычнага наступленьня ў СССР. Тым большая пільнасьць патрэбна сусьветнаму пралетарыяту, тым больш напагатове павінны быць усе сэкцыі Камінтэрну!

Прэзыдыум ВККІ яшчэ і яшчэ раз напамінае сэкцыям усе пастановы Камінтэрну, якія датычаць арганізацыі абароны краіны пралетарскай дыктатуры — адзінае бацькаўшчыны працоўных усіх краёў.

Пасылаючы сваё палкае бальшавіцкае прывітаньне рабочай клясе, перадавому сялянству СССР і Чырвонай арміі. Прэзыдыум ВККІ запэўняе іх у тым, што клясавыя баі пралетарыяту і ўсіх прыгнечаных, якія разгортваюцца ўсё шырэй, непарыўна зьвязаны са справаю абароны СССР у імя пасьпяховага завяршэньня вялікага пляну, у практычным правядзеньні якога працоўныя ўсіх краёў упяршыню ў гісторыі клясавай барацьбы ўбачылі з поўнай выразнасьцю свой шлях заваяваньня сацыялізму ва ўсім сьвеце.

Па дакладзе тав. Лазоўскага аб V кангрэсе Прафінтэрну

Ва ўмовах абвастрэньня эканамічных і палітычных баёў рабочае клясы і агульнага ўздыму рабочага руху работа рэвалюцыйных прафсаюзаў, рэвалюцыйнай апазыцыі і сусьветнага цэнтру рэвалюцыйнага прафруху—Прафінтэрна—набывае асабліва важнае значэньне. Імена таму падрыхтоўка да V кангрэсу Прафінтэрну павінна выйсьці за межы звычайных традыцыйных мэтадаў і павінна мець мэтавы, ударны характар. Задача заключаецца ў тым, каб ператварыць V кангрэс у сур'ёзную веху для ўсяго сусьветнага рабочага руху. IV кангрэс меў вялізарнае значэньне ў сэнсе ідэйнай і арганізацыйнай кансалідацыі сіл рэвалюцыйнага прафруху. Але кангрэс гэты адбываўся ля самага парогу ўздыму рабочага руху, тады як V кангрэс зьбіраецца ў абстаноўцы значнага абвастрэньня клясавых баёў, і таму V кангрэс Прафінтэрну павінен, на падставе ўсямернага разгортваньня рэвалюцыйнай работы ў масах, пайсьці далей у сэнсе пастаноўкі і вырашэньня пытаньняў, узьнікшых на аснове практыкі апошніх эканамічных баёў, у пэрыяд узрастаючага крызісу і масавага беспрацоўя. У сувязі з V кангрэсам перад усімі кампартыямі стаяць наступныя задачы:

1. Праверыць, як праводзіліся на практыцы пастановы IV кангрэсу і VI сэсіі цэнтральнага савету Прафінтэрну.

2. Падагуліць, у якім стане знаходзяцца камфракцыі ў прафсаюзах і якія прычыны слабасьці гэтых фракцый.

3. Дакладна праверыць і адкрыта абмеркаваць слабыя бакі ў рабоце рэвалюцыйных прафсаюзаў і мэтады паляпшэньня работы.

4. Праверыць работу прафапазыцыі ў руху меншасьці, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на формы іх сувязі з масамі і мэтады арганізацыйнай і масавай работы.

5. Усебакова абмеркаваць ў партыйнай прэсе асноўныя праблемы сусьветнага рэвалюцыйнага прафруху, адкрыўшы для гэтага асобныя старонкі пад назваю «Да V кангрэсу Прафінтэрну».

6. Узяць ініцыятыву па абмеркаваньні ў масах усіх пытаньняў, зьвязаных з V кангрэсам, ня толькі на прафсаюзных канфэрэнцыях і зьездзе, але і непасрэдна ў прадпрыемствах.

7. Забясьпечыць праз работу камфракцый прадстаўніцтва на V кангрэсе рабочых і работніц ад варштату, асабліва асноўных галін прамысловасьці (горная справа, мэталюргія, транспарт, хэмічная прамысловасьць і г. д.).

8. Уся работа па падрыхтоўцы V кангрэсу павінна праводзіцца пад знакам суровай самакрытыкі і рашучай барацьбы супроць прафсаюзнага легалізму і апартунізму на практыцы і ўсямернага ўзмацненьня масавай прафсаюзнай работы.

Прэзыдыум Камінтэрну надае выключна вялікае значэньне сур'ёзнай падрыхтоўцы V кангрэсу Прафінтэрну і даручае ўсім сэкцыям правесьці гэту работу, выкарыстаўшы пры гэтым мэтады міжнароднага рэвалюцыйнага спаборніцтва.

На барацьбу за прамфінплян

Бярэце прыклад з лепшых прадпрыемстваў

Швейная фабрыка „Кастрычнік“ застаецца на чырвонай дошцы

У студзені на Менскай швейнай фабрыцы «Кастрычнік» вызначыўся прарыў у выкананьні прамфінпляну. Вытворчая праграма была выканана ўсяго на 84,4 проц.

Для прадпрыемства, якое ўвесь час было ўперадзе іншых швейных фабрык, гэта быў вялікім ударам. Як толькі сталі вядомы лічбы выкананьня вытворчай праграмы, адразу-ж заварушылася ўся фабрыка. Была склікана канфэрэнцыя ўдарнікаў, на якой швейнікі, вызначыўшы ў сваіх выступленьнях прычыны прарыву, давалі аднадушную клятву, што такая работа зьяўляецца апошняй для ўсяго калектыву.

— Усе грамадзкія арганізацыі павінны заняць свае месцы.

— Узмацніць кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі,—такі наказ дала канфэрэнцыя ўдарнікаў.

Фабрыка перайшла на сапраўды баявыя тэмпы работы. Былі створаны ўдарныя брыгады па праверцы ходу сацспаборніцтва. Вытворчыя камісіі пачалі вывучаць работу ўдарных брыгад. Рабочыя першай зьмены далі ўрачыстае абяцаньне зьнішчыць прагулы па няпаважлівых прычынах. На прыкладзе першай зьмены пайшлі рабочыя ўсёй фабрыкі.

Друкаваная газэта «Голас Краўца» шырока асьвятліла прычыны прарыву. Разам з усім калектывам мабілізавалі сябе адміністрацыйна-тэхнічныя работнікі.—Сацспаборніцтва—ня проста конкурс,—адзначылі майстры на агульным сходзе рабочых,—а вялікай важнасьці дзяржаўная справа».

— Адзін за ўсіх, усе за аднаго,—заключылі ў сацдагаворы інструктары. — Агульны дружны націск і прамфінплян будзе выкананы з перавышэньнем.

Мабілізацыя ўвагі ўсяго калектыву прынесла свае вынікі. У лютым вытворчая праграма была ўжо выканана на 107,78 проц., у першай палове сакавіка — на 104,16 проц., а за 20 дзён сакавіка—на 105,5 проц.

Праўда, ёсьць яшчэ сякія-такія недахопы ў асобных зьменах. Прагулы па няпаважлівых прычынах ня ўсе яшчэ зьнішчаны і дасягаюць 0,2 проц. У асобных зьменах брак дасягае 25—30 штук вопраткі, якую трэба перашываць. Але зацікаўленасьць вытворчасьцю ўсяго калектыву дае гарантыю, што і гэтыя недахопы будуць зьнішчаны.

Трэба адзначыць, што добрай працы фабрыкі спрые таксама ўлік сацспаборніцтва, які пастаўлен на належную вышыню. Адміністрацыя кожны дзень складае «сутачную ведамасьць аб дасягненьнях і недахопах агрэгатаў». Заўком кожны дзень інфармуе рабочых аб ходзе сацспаборніцтва. Гэта дае магчымасьць цэхавым ячэйкам адразу-ж рэагаваць на недахопы. Апрача таго, заўком кожныя 6 дзён заслухоўвае паведамленьні аб выкананьні прамфінпляну і дае паказаньні, на якія слабыя вучасткі трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Шырока пастаўлена на фабрыцы культурна-выхаваўчая работа. Гэта павялічыла актыўнасьць мас, што ў сваю чаргу павялічыла наведваньне сходаў, пасяджэньняў і гурткоў.

— Згубленае мы знойдзем,—кажуць фабрычныя работнікі.—Але шкада, што ў нас няма клюбу, няма дзе разгарнуць сапраўды масавую работу. Усё-ж нічога, «аб'ектыўныя прычыны» мы ўжо пахавалі, даб'емся зьнішчэньня і ўсіх іншых прычын,—з усьмешкай сказаў на разьвітаньне старшыня заўкому тав. Левін.

А. МАНЬКОЎ.

ЛЕПШАЯ РАБОТНІЦА

Ударніца хэмфармзаводу т. Варакса. Зьнізіла добраахвотна расцэнкі на 8 проц.

НА ГЭТЫМ НЯ СПЫНІМСЯ

Дражджавы завод «Чырвоная Зара» (Менск) працуе ў вельмі напружаных умовах. Увесь час попыт на дрожджы вельмі абмежаваны і таму мы ня можам павялічыць колькасны паказальнік вытворчасьці да разьмеру, вызначанага прамфінплянам. За 5 месяцаў завод вытворчай праграмы ня выканаў. Затое **якасныя паказальнікі выкананы са значным перавышэньнем.**

Сабекошт прадукцыі паводле прамфінпляну і сацдагавору павінен быць—32,16 кап. клгр. У кастрычніку і лістападзе сабекошт клгр. дрожджаў складае 33,76 кап., г. зн. на 5 проц. вышэй плянавага заданьня, але ўжо сьнежань дае зьніжэньне сабекошту да 31,35 кап., студзень—**да 29,95 кап.,** а люты—да 29,52 кап., **г. зн. на 8,28 проц. ніжэй плянавага заданьня.**

Тое-ж самае становішча з **прадукцыйнасьцю працы.** Калі ў першым квартале заданьне па павышэньні прадукцыйнасьці працы выканана на 97,26 проц., дык у студзені—на 112,3 проц., а ў лютым—на 114,2 проц.

Гэтыя добрыя вынікі тлумачацца шырокай мабілізацыяй увагі рабочых заводу наўкола прарыву, які мы мелі за першыя два месяцы гаспадарчага году. Рабочыя заводу абвясьцілі сябе ўдарнікамі. **Ня гледзячы на пераход на 7-гадзінны дзень,** рабочыя і работніцы добраахвотна павысілі нормы выпрацоўкі **на 5—20 проц.,** зьнізілі нормы выдаткаваньня апалу, тлушчу і г. д.

Усё-ж мы лічым, што нашы дасягненьні не зьяўляюцца гранічнымі. Уся работа калектыву і заводзкіх арганізацый мае адну мэту — перавыканаць прамфінплян і дабіцца яшчэ большага паляпшэньня нашай прадукцыі і паляпшэньня яе якасьці.

І. Б.

СПЛАЎ ЛЕСУ ПАЧАЎСЯ

Гаспадарчыя арганізацыі не падрыхтаваліся да сплаву

Становішча з рабочай сілай пагражаючае

Наш супрацоўнік меў гутарку з старшынёй Рэспубліканскага камітэту саюзу с.-г. рабочых тав. **Манжалеем** па пытаньні аб тым, як праходзіць падрыхтоўка да сплаву ў БССР.

БССР мае вялізарнейшае значэньне ў агульным выкананьні плянаў сплаву, бо па рэках Беларусі будзе праводзіцца сплаў з усёй Заходняй вобласьці. У гэтым годзе рэкі ўскрыліся значна раней, чым заўсёды, і сплаў фактычна ўжо распачаўся. Вясна ў гэтым годзе значна апярэдзіла тэмпы работы нашых гаспадарчых арганізацый, **і сплаў сустрэў нашы арганізацыі зусім непадрыхтаванымі.** Лесбел і Украінлес да апошніх дзён вельмі мала ўвагі звярачалі на гэтае важнейшае пытаньне.

Рэспубліканскім камітэтам саюзу с.-г. рабочых было прапанавана прыступіць да вербоўкі пастаяннага кадру плытагонаў з 8.000 чалавек. Да гэтай работы **ні адна арганізацыя яшчэ нават на сёньняшні дзень не прыступіла.** Цікава адзначыць, што **ліст аб падрыхтоўцы пастаянных 8.000 рабочых для сплаву толькі 10 дзён як падпісаны Наркампрацай, Лесбелам і саюзам, але далей канцылярый гэтых устаноў не пайшоў,** і на месцах яшчэ нічога ня ведаюць аб гэтай важнейшай дырэктыве.

Вельмі дрэнная справа з забесьпячэньнем сплаву рабочай сілай з ліку калгасьнікаў. Калгасцэнтр і Наркампрацай ніякіх практычных мер да выяўленьня забесьпячэньня сплаву плытагонамі-калгасьнікамі не прадпрыняў. Гаспадарчыя арганізацыі ніякай увагі не звярачаюць на сацыяльны адбор рабочых для сплаву. Лесбел і Наркампрацай ня ведаюць, каго яны набіраюць, і ёсьць небясьпека, што кадр сплаўшчыкаў будзе засьмечаны чужым кулацкім элемэнтам.

Усяго для сплаву сёлета патрабуецца ня менш 100.000 рабочых-сплаўшчыкаў, **а на сёньняшні дзень толькі навербавана прыкладна 15.000 чалавек.**

Такім чынам, пытаньне аб забесьпячэньні сплаву патрэбнай рабочай сілай застаецца вельмі пагражаючым.

Шырокая грамадзкасьць да апошняга часу на гэта звярачала вельмі мала ўвагі і ня была мабілізавана вакол пытаньняў сплаву. Рэспубліканскі камітэт саюзу с.-г. рабочых узьняў пытаньне аб мабілізацыі 10.000 камсамольцаў для ўзмацненьня сплаву. Але **да гэтага часу нічога ня зроблена для правядзеньня гэтай важнейшай прапановы ў жыцьцё. Грамадзкія арганізацыі і сельсаветы пытаньнямі сплаву да апошняга часу таксама не займаліся.**

Ня лепшая справа і з забесьпячэньнем сплаўшчыкаў грамадзкім харчаваньнем і спэцвопраткай. Ня гледзячы на тое, што Лесбел заключыў умову аб арганізацыі сталовак, **на сёньняшні дзень на сплаве яшчэ няма ні аднэй сталоўкі.** З 25.000 патрэбных для сплаўшчыкаў ботаў, ёсьць усяго 5.000 пар, што ставіць пад угрозу выкананьне цэлага раду работ.

Прадуктамі харчаваньня сплаўшчыкі будуць забясьпечаны поўнасьцю. Наркамгандлю распрацаваны нормы выдачы прадуктаў сплаўшчыкам, прычым рад прадуктаў будзе выдавацца ў павялічаных нормах.

Значна лепшая справа з забесьпячэньнем сплаву патрэбным такелажам і абсталяваньнем.

Саюз с.-г. рабочых распрацаваў падрабязны плян культабслугоўваньня сплаўшчыкаў. Намечана арганізацыя цэлага раду плывучых чырвоных куткоў, перасоўных бібліятэчак і рад іншых мерапрыемстваў па культурным абслугоўваньні сплаўшчыкаў. Але, на жаль, трэба адзначыць, што **саюз зусім ня мае вестак, як на месцах праводзіцца падрыхтоўка да культурнага обслугоўваньня сплаўшчыкаў.**

Гаспадарчыя арганізацыі, якія займаюцца сплавам, саюзы і вясковая грамадзкасьць павінны дабіцца, каб работа па сплаве вялася ва ўдарным парадку, каб поўнасьцю можна было скарыстаць паводку і выканаць намечаныя пляны па сплаве.

Арк.

Апэрацыйная зводка вывазкі лесу

Паводле даных Лесбелу, за другую пяцідзёнку сакавіка вывезена 231.000 куб. мэтраў лесаматар'ялаў, або 6,1 проц. гадавога пляну. Слабая вывазка тлумачыцца канчатковым раскісаваньнем дарог; толькі выпаўшы 17-га сакавіка сьнег трошкі палепшыў становішча.

Наогул па 21-га сакавіка вывезена 73,4 проц. плянавага заданьня па лесаматар'ялах.

На першым месцы па вывазцы ідзе ВІЦЕБСКАЯ АКРУГА, якая выканала 99,3 проц. заданьня, на другім Полацкая — 94,7 проц. Трошкі падцягнуліся Чэрвенскі і Вузьдзенскі лесараёны. Адстае Мазыршчына, якая выканала толькі 59,4 проц.

Апарат Лесбелу засьмечаны

БАГУШЭЎСК. (Наш кар.). За ўвесь сезон на Багушэўскім і Дальвінскім лясьніцтвах загатоўлена 45 проц. заданьня па лесаматар'ялах, вывезена толькі 35 проц. Чым тлумачыцца зрыў лесазагатовак на раёне? Перш усяго тым, што прараб Лібензон не зьвярнуў ніякае ўвагі на вярбоўку лесарубаў і возчыкаў. Ён набраў сабе ў кантору ў якасьці служачых чужы элемэнт: кулачка Біна, растратчыка Вільчынскага, выключанага з саматужнай арцелі Пяўзнера і інш.

Лясьнікі з рубшчыкамі не разьлічваліся на працягу 2-х месяцаў.

Шмат у чым вінавата тут і аршанская інспэкцыя працы, якая дазволіла вербаваць у раёне лесарубаў для загатовак у Карэліі, на Мурмане і ў Сібіры, не ўжыла мер, каб спыніць нездаровую канкурэнцыю вярбоўшчыкаў.

Пры наяўнасьці ў раёне 4.050 коняй далі Мурман—лесу 580, для возкі камення — 750. У выніку, каб выканаць плян загатовак, трэба ўвезьці ў раён 2.000 фурманак.

Неабходна тэрміновая чыстка апарату Лесбелу на раёне, папаўненьне яго новымі працаўнікамі.

ЗАМАЦАВАЦЬ ДАСЯГНУТЫЯ ПОСЬПЕХІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Выправім скажэньні і перагібы, якія зараз зьяўляюцца асноўным тормазам далейшага росту калгаснага руху, простай дапамогай клясаваму ворагу

МАБІЛІЗУЕМ БАТРАЦКА-БЯДНЯЦКІЯ І СЕРАДНЯЦКІЯ МАСЫ СУПРОЦЬ КУЛАКА

„Адозва“ Рагачэўскага РК КП(б)Б і РВК

У Рагачэўскім раёне (Бабруйшчына) пры правядзеньні калектывізацыі быў дапушчан рад скажэньняў лініі партыі. Мясцовыя працаўнікі ў некаторых сельсаветах, замест растлумачальнай работы сярод беднаты і сераднякоў, ужывалі мэтады адміністраваньня, запалохваньня, прымушаючы сялян уступаць у калгасы.

Спачатку як быццам усё «ішло добра», процанты калектывізацыі расьлі — сяляне прымалі пастановы аб уступленьні ў калгасы. Але далей гэтых пастаноў справа ня рушылася. Мясцовыя працаўнікі нічога не рабілі, каб замацаваць арганізаваныя калгасы, каб стварыць у іх батрацка - бядняцкія групы, каб арганізаваць у іх працу. Частка калгасаў існавала фактычна толькі на паперы.

Кулак, які шалёна супраціўляецца, які імкнецца сарваць усе мерапрыемствы савецкай улады па вёсцы, выкарыстаў скажэньні лініі партыі, якія былі дапушчаны мясцовымі працаўнікамі. Кулак пачаў актыўную агітацыю за разбурэньне калгасаў, за дэзарганізацыю іх работы.

У радзе месц, дзе калгасы ня былі замацаваны, дзе бедната і батрацтва ня былі згуртаваны, дзе ня былі створаны батрацка - бядняцкія групы, — там частка беднякоў і сераднякоў паддалася на кулацкую правакацыю. Некаторыя беднякі і сераднякі ў гэтых мясцох пачалі выходзіць з калгасаў, разьбіраць абагуленую жывёлу, інвэнтар і насеньне.

Што-ж рабілі ў гэты час мясцовыя савецкія і партыйныя працаўнікі? Замест выпраўленьня сваіх памылак, замест руйнуючага адпору кулаку, замест шырокай растлумачальнай і арганізацыйнай работы сярод беднаты і батрацтва, замест замацаваньня калгасаў, — яны апынуліся ў ролі наглядальнікаў: сядзелі і чакалі.

Апублікаваны новы статут с.-г. арцелі і артыкул тав. Сталіна прымусіў іх крыху «прачнуцца». Але замест таго, каб прызнаць свае памылкі і зрабіць з гэтага належныя вывады, кіраўнікі Рагачоўскага раёну зрабілі нешта зусім іншае.

Райком і райвыканком зварачаюцца з адозваю (!) «Да ўсіх рабочых, батракоў, беднякоў, сераднякоў і калгасьнікаў Рагачэўскага раёну». У гэтай адозве яны пачынаюць «тлумачыць» бядняцка-серадняцкім масам артыкул тав. Сталіна і новы статут с.-г. арцелі. Але як яны гэта робяць? Вось паслухайце:

«Апошнюю дырэктыву партыі ў артыкуле тав. Сталіна, якая была накіравана на перабудову калгасу на грунце новага статуту, у мэтах хутчэйшага наладжаньня яго працы, кулак скарыстаў у мэтах развалу калгасу. На жаль, частка беднаты і серадняцтва, асабліва адсталая частка жанчын, пайшлі за кулаком, кінуліся выконваць яго справу...».

Такім чынам, Рагачоўскае кіраўніцтва, каб утаіць свае памылкі, «левыя» заскокі, перагібы і праявы правага апартунізму, пачало прадстаўляць справу такім чынам, быццам у іх усё «ішло добра», але вось зьявіўся артыкул тав. Сталіна і новы статут с.-г. арцелі і кулакі «скарысталі» артыкул і статут «для разбурэньня калгасаў».

Ні аднаго слова не гаворыцца ў адозьве аб галавацяпствах і скажэньнях партыйных дырэктыў, дапушчаных мясцовымі працаўнікамі, ні аднаго слова не гаворыцца аб тым, што гэтыя галавацяпствы і унцэр-прышыбееўскія мэтады пры правядзеньні калектывізацыі былі асноўнай прычынай, якая прывяла да распаду часткі калгасаў. Гэтыя імкненьні зьняць з сябе адказнасьць за дапушчаныя галавацяпствы і перакласьці яе на каго-небудзь, на «аб'ектыўныя» ўмовы — ня новыя. Гэта найбольш выразны прыклад праяўленьня апартунізму на практыцы.

Але паслухайце далей, як рагачэўскія кіраўнікі растлумачваюць сялянству значэньне новага статуту і як яны яго мяркуюць праводзіць у жыцьцё.

Вось як аб гэтым далей гаворыцца ў адозьве:

«Тыя, хто выконвае справу кулака, зьяўляюцца агентамі кулака. Партыя ўзяла цьвёрды напрамак на ліквідацыю кулацтва, як клясы, але партыя і савецкая ўлада будуць прыцягваць да самай суровай адказнасьці і тых, хто будзе выконваць іх справу, шкодзіць калгаснаму будаўніцтву... За самачынны разбор абагуленай маемасьці калгасу незалежна ад таго, хто гэта будзе рабіць, будзе прыцягнут да крымінальнай адказнасьці ў судовым парадку».

Такім чынам, **замест правядзеньня ў жыцьцё новага статуту,** замест руйнуючага адпору кулаку, замест шырокай растлумачальнай работы сярод беднаты, батрацтва і серадняцтва, рагачоўскія кіраўнікі зноў знаходзяць для сябе магчымым ужываць свае «выпрабаваныя» «мэтады» пагроз.

Такі зьмест «адозвы» Рагачоўскага РК КП(б)Б і РВК можна тлумачыць толькі нежаданьнем прызнаць свае памылкі і зрабіць з гэтага належныя практычныя вывады.

А. М.

Бюро Рагачэўскага РК распушчана

БАБРУЙСК, 24. (Па тэлефону). Бюро **Бабруйскага АК КП(б)Б** пастанавіла **распусьціць бюро Рагачэўскага** раённага камітэту, якое ў сувязі з артыкулам т. **Сталіна** «Головокружение от успехов» і апошняй пастановай ЦК УсеКП(б), выдала адозву, якую нельга інакш расцэньваць, як выступленьне супроць лініі партыі.

Бюро АК адзначыла, што кіраўніцтва Рагачэўскага раённага камітэту ня здольна праводзіць генэральную лінію партыі. Увесь кіраўнічы склад раённага камітэту зьняты з работы.

Бюро акругкому заастрыла ўвагу новага кіраўніцтва Рагачэўскага райкому і ўсёй раённай партарганізацыі на патрэбу па-бальшавіцку разгарнуць барацьбу за выпраўленьне дапушчаных прарываў і поўнае выкананьне задач, паказаных у артыкуле т. Сталіна пастанове Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б).

Акругком, РОЙЗЭМАН.

ЗАРАЗ-ЖА ПЕРАБУДАВАЦЦА!

У габінэце сакратара Касьцюковіцкага раённага камітэту партыі тав. Бакшылава вісіць карта з надпісам: «Схематычны плян суцэльнай калектывізацыі Касьцюковіцкага раёну».

На выкананьне гэтага пляну былі кінуты ўсе партыйныя і савецкія працаўнікі раёну, усе агратэхнічныя сілы. Складзеныя брыгады разьяжаліся па вёсках, дзе растлумачвалі сялянству аб значэньні калектывізацыі і калгасным будаўніцтве.

Вялікая колькасьць беднякоў і сераднякоў добраахвотна пайшла ў калгасы. Яна зразумела выгаднасьць калектыўнай гаспадаркі перад гаспадаркай індывідуальнай. За студзень месяц у калгасы ўступіла 46 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну.

Гэтыя дасягненьні ў галіне калектывізацыі ўскладалі на касьцюковіцкіх партыйных і савецкіх працаўнікоў, на партыйна-савецкае кіраўніцтва Касьцюковіцкага раёну вельмі адказныя задачы. Але ў касьцюковіцкіх кіраўнікоў ад посьпехаў закруцілася галава. Яны забыліся, што мала навесьці бядняцка-серадняцкія масы ў калгасы, яны забыліся, што трэба яшчэ гэтыя калгасы арганізацыйна замацаваць. У Касьцюковічах-жа не замацаваўшы калгасы адразу **пераскочылі да камун.**

— У вас арцелі, а вось, у нас адны камуны—хваліліся касьцюковіцкія работнікі.

«Мы ўсё можам, нам усё нипачым».

Побач з гэтымі «левымі» загібамі ў раёне мелі месца факты праваапартуністычнай практыкі.

За 6 месяцаў ні бюро, ні пленум райкому КП(б)Б ні аднаго разу не абгаворвалі пытаньня аб рабоце сярод беднаты, аб арганізацыі батрацка-бядняцкіх груп у калгасах. У большасьці калгасаў гэтыя групы ня былі арганізаваны, а там, дзе яны былі—фактычна існавалі на паперы ніякага ўплыву на арганізацыю калгасаў, на іх замацаваньне ня мелі. Ёсьць нават калгасы, дзе ў групы беднаты ўваходзілі толькі... адны сераднякі, у іншых мясцох у гэтыя групы ўваходзілі адны камуністыя. З прычыны адсутнасьці ўсякай работы сярод беднаты, на раённую канфэрэнцыю батрацка-бядняцкіх груп зьехалася ўсяго толькі 30 чалавек.

Ня гледзячы на тое, што Касьцюковіцкі раён зрабіўся раёнам суцэльнай калектывізацыі, там марудзілі з ліквідацыяй кулацтва, як клясы. У Гаўрылінскім і Бялынкавіцкім сельсаветах у кулакоў не канфіскавалі маемасьці. У другіх сельсаветах раскулачылі толькі напалову. У выніку гэтых прымірэнчых адносін да кулака ў некаторыя калгасы пралезьлі кулакі і пачалі там весьці шкодніцкую работу. На вачох парт'ячэйкі ў Баранькаўскім сельсавеце ў праўленьне камуны імя 1-га мая пралезьлі кулакі Даніленка і Выжанкоў. Першы нават пралез у старшыні камуны. У яўрэйскай арцелі «Дас Лебн» верхаводзяць былыя гандляры, пазбаўленыя праў Забранскі і Пісьман.

Пры правядзеньні раскулачваньня, у некаторых мясцох, былі закрануты і **сераднякі.**

Усе дапушчаныя ў Касьцюковіцкім раёне грубыя палітычныя памылкі і скажэньні дырэктыў партыі ў выніку скарыстаў кулак.

Кулакі пачалі шалёную агітацыю за разбурэньне калгасаў, за разбор абагуленае жывёлы, інвэнтару і насеньня.

У радзе месц, дзе сярод беднякоў і сераднякоў не вялося ніякай растлумачальнай работы, дзе ня былі арганізаваны батрацка-бядняцкія групы — там кулаком удалося справакаваць калгасьнікаў, якія пачалі выходзіць з калгасаў і разьбіраць абагуленыя сродкі вытворчасьці.

Мясцовыя работнікі несваячасова рэагавалі на кулацкія выступленьні, не згуртавалі бядняцкія і серадняцкія масы сялянства для адпору кулацкай агітацыі.

Замест перавода калгасаў на новы статут с.-г арцелі, замест папулярызацыі гэтага статуту, партыйцы Брусінскага сельсавету, напрыклад, хавалі ад калгасьнікаў газэты, у якіх быў надрукаваны статут і артыкул т. Сталіна. І ня дзіва, што артыкул т. Сталіна і новы статут с.-г арцелі ўдарыў брусінскіх калектывізатараў, якія ўпарта не жадалі выпраўляць свае палітычныя памылкі і скажэньні правільнай лініі партыі, «ня ў брыво, а проста ў вока».

Зараз, калі да пачатку сяўбы засталося некалькі тыдняў, Касьцюковіцкі раён зусім не падрыхтаваны выйсьці ў поле. Рабочыя пляны ў калгасах дагэтуль не складзены, машына-конныя станцыі не арганізаваны, таксама ня скончана яшчэ і зямляўпарадкаваньне калгасаў, ня вызначаны яравы клін, як для калгасаў, так і для індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Касьцюковіцкая партыйная арганізацыя павінна зараз-жа перабудаваць усю сваю работу, безадкладна выправіць усе дапушчаныя скажэньні лініі партыі, у бліжэйшыя-ж дні перавесьці ўсе калгасы на новы статут с.-г. арцелі, мабілізаваць бядняцка-серадняцкія масы да практычнай падрыхтоўкі да сяўбы, замацаваць існуючыя калгасы, разгарнуць шырокую растлумачальную работу сярод батракоў, беднякоў і сераднякоў. Асаблівую ўвагу касьцюковіцкае кіраўніцтва павінна зьвярнуць на работу сярод беднаты, на стварэньне ў калгасах батрацка-бядняцкіх груп.

Магілеўскі акругком таксама павінен зрабіць адпаведныя вывады і ўмацаваць кіраўніцтва Касьцюковіцкага раёну.

Брыгадзір «Зьвязды» ВОІНАЎ.

У баку ад важнейшай работы

Месячнік ашчаднасьці праходзіць без належнага ўдзелу мясцовых арганізацый

Праз тыдзень канчаецца месячнік ашчаднасьці, які ўжо быў два разы працягнуты. Трэба адзначыць, што вынікі месячніка далёка нездавальняючыя, бо кантрольныя лічбы выкананы ў нязначнай меры.

Невыкананьне заданьняў па павялічэньні ўкладаў тлумачыцца выключна тым, што мясцовыя арганізацыі нядбайна

КАЛГАСЬНІЦА - АГАРОДНІЦА ЗА ПРАЦАЙ У ПАРНІКУ

аднесьліся да гэтае справы, недаацанілі значэньня месячніка.

Аб гэтым сьведчыць рад лістоў, атрыманых рэдакцыяй ад рабселькораў і рабочых брыгад, якія выяжджалі для праверкі ходу месячніка ашчаднасьці.

Рабочая брыгада з Крупскага раёну, напрыклад, паведамляе, што раённая камісія садзейнасьці ашчаднай справе нядбайна аднеслася да месячніка. Няма чаго ўжо гаварыць аб камісіях пры сельсаветах, дзе работа зусім адсутнічала. Кампанія заключэньня індывідуальных дагавароў амаль не распачата. Не праведзена ніякай растлумачальнай работы сярод сялян і членаў саюзу. Кантрольныя лічбы месячніка не давядзены да сельсаветаў і агенцтваў раёну. Вярбоўка ўкладчыкаў праходзіць самацёкам. Сходы з дакладамі аб месячніку не праводзіліся.

Рабочая брыгада гарбарні «Бальшавік», якая выяжджала ў Барысаўскі раён, паведамляе, што месячнік ашчаднасьці на прадпрыемствах Барысава амаль не адчуваецца — нізавыя партыйныя і прафарганізацыі не вядуць ніякай растлумачальнай работы, заяўляючы, што яны перагружаны іншай работай. На заводзе «Камінтэрн» сакратар парт'ячэйкі адказаў, што месячнік—апошняя справа, якою займацца няма часу.

Рабкорка **Лагун** са ст. Ворша піша, што на асобных службах вузла нічога ня зроблена, каб уцягнуць новых укладчыкаў. Заўважваецца нават адлік укладаў. Вузлавая камісія садзейнасьці амаль ня зьбіралася.

Рабочы клюб адным словам не абмовіўся аб гэтай кампаніі. Насьценгазэты вельмі дрэнна папулярызавалі месячнік ашчаднасьці. Наогул, вярбоўка праходзіць самацёкам. «Пахне поўным правалам» — піша тав. Лагун.

Селькор тав. **Дрозд** паведамляе з **Пухавіцкага раёну,** што мясцовыя арганізацыі і культ. сілы раёну амаль ня прымаюць удзелу ў правядзеньні месячніка, перакладаючы ўсю работу на плечы ашчадкас і пошты.

Аб гэтым-жа піша тав. **М. Гурэвіч** з **Копысю,** які падкрэсьлівае, што раённая камісія садзейнасьці ня кіруе правядзеньнем месячніка.

Месячнік канчаецца, але гэта ня значыць, што арганізацыі павінны абмежавацца тым, што зроблена і «пачыць на лаврах». **Вярбоўка ўкладчыкаў, укараненьне ідэі ашчаднасьці, папулярызацыя ашчадных кас, наладжаньне безнаяўных разьлікаў павінна стаць сыстэматычнай работай усіх нашых арганізацый.**

З раду месц паступаюць весткі аб перагібах у адносінах вярбоўкі ўкладчыкаў, аб парушэньні прынцыпу добраахвотнасьці.

Агульны сход супрацоўнікаў **Наркамгандлю** вынес пастанову стварыць да 13 гадавіны Кастрычніка ў ашчадных касах бранізвалы фонд накапленьняў, які павінен складаць ня менш 25% месячнай пэнсіі калектыву. Супрацоўнікі павінны на выйграныя сумы набываць абліганцыі і выйгрышы па пазыках здаваць у ашчадкасу. Усе 100% супрацоўнікаў павінны ўступіць у ашчадкасу.

Калі гэта парадная дэклярацыя, дык навошта выносіць пастановы, якія вельмі цяжка правесьці ў жыцьцё. Калі гэта сапраўднае абавязацельства, дык тут мае месца самае рэзкае парушэньне прынцыпу добраахвотнасьці ў ашчаднай справе.

Агульны сход калектыву пабудовы **Магілеўскай шаўковай фабрыкі** пастанавіў «тэрміновым парадкам» адлічыць 5% заработку для ўнясеньня ў ашчадкасу тэрмінам на 6 месяцаў, апрача гэтага рабіць выплату пэнсіі праз ашчадную касу. Наш карэспандэнт з «абурэньнем» адзначае, што асобныя працаўнікі супярэчылі прынцыпу пастановы, але атрымалі рашучы адпор.

Мы перасьцерагаем усіх тых, хто імкнецца «бліснуць» вялікай колькасьцю ўкладчыкаў, ад усякіх спроб прымусам навязаць годнасьць укладчыка.

Усіх тых, хто парушае асноўны прынцып ашчаднай справы і дзяржкрэдыту — поўную добраахвотнасьць—трэба прыцягваць да адказнасьці, бо яны толькі дыскрэдытуюць самую ідэю ашчадсправы.

Больш растлумачальнай работы, больш папулярызацыі, больш шырокага азнаямленьня працоўных з задачамі дзяржкрэдыту, — толькі так трэба дапамагаць правядзеньню месячніка ашчаднасьці.

Б.

Што выявіла праверка нізавога апарату

Парушэньні клясавай лініі ў рабоце сельсаветаў і каапэрацыі.—З нізавога апарату вычышчана 2.390 чал

Праверка і чыстка нізавога савецкага апарату, побач з засьмечанасьцю яго чужым элемэнтам, асабліва ў органах каапэрацыі і дзяржгандлю (загатоўшчыкі сырцу) выявіла рад буйных недахопаў у практычнай рабоце як сельскіх, так і раённых устаноў. У асноўным гэтыя недахопы, выяўленыя дзякуючы вялікай актыўнасьці і зацікаўленасьці бядняцка - батрацкага і серадняцкага сялянства, зьявіліся вынікам зусім нездавальняючага асабістага складу нізавога савецкага апарату.

Асабліва дрэнная справа з **правядзеньнем у жыцьцё клясавай лініі.** Тут, па прычыне таго, што сельсаветы ня ўцягвалі беднаты і батрацтва ў практычнае ажыцьцяўленьне гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў партыі і ўлады, мелі месца такія выпадкі, як разьмеркаваньне сенажаці па колькасьці жывёлы — больш жывёлы, больш сенажаці; невыяўленьне кулацкіх гаспадарак для індывідуальнага абкладаньня (Зарубецкі сельсавет, Крычаўскага раёну, з 20 кулацкіх гаспадарак паказаў толькі 4 і г. д.), купля і продаж зямлі (старшыня Хойніцкага раёну адкупіў у бедняка зямлю за 300 руб.), прадастаўленьне кулацкім гаспадаркам ільгот за гарэлку (па тым-жа Хойніцкім сельсавеце), разьмеркаваньне заданьняў па збожжазагатоўках пагалоўна на ўсіх сялян; выдача кулаком даведак, як беднякам. Можна падаць сотні аналёгічных прыкладаў.

Выяўлен рад выпадкаў **бюракратызму і цяганіны.** Так, напрыклад, у Жлобінскім сельсавеце ў часе праверкі яго працы знойдзена рад заяў беднякоў, якія не разглядаліся амаль што на працягу году. Выяўлены моманты парушэньня савецкай дэмакратыі, калі старшыня сельсавету самастойна як па форме, так і па сутнасьці скасаваў пастанову пленуму сельсавету па збожжазагатоўках, вызваліўшы ад раскладкі частку заможных.

Ня менш недахопаў выяўлена **ў рабоце нізавой спажывецкай і с.-г. крэдытнай каапэрацыі,** дзе, акрамя засьмечанасьці апарату чужым элемэнтам (былыя гандляры, якія нядаўна пакінулі гандаль, пазбаўленцы, кулакі і інш.), выяўлен бюракратызм і няўважлівыя адносіны да насельніцтва. Вось некалькі прыкладаў.

Выяўлена дрэнная ахова лясоў як дзяржаўных, так і мясцовай значнасьці, калі за гарэлку і хабары разбазарваўся лес па прычыне таго, што ў рады лясное варты пралез чужы элемэнт.

На аснове выяўленых парушэньняў камісіі выявілі канкрэтных парушыцеляў клясавае лініі, хабарнікаў і наогул чужы элемэнт і вычышчалі яго з савецкага апарату.

Да 15 сакавіка вычышчана па ўсіх акругах (па 63-х раёнах) 2.390 чалавек, з іх па першай катэгорыі — 822 чал., па другой — 1.190 чал і па трэцяй — 754 чал. Найбольшы лік вычышчаных падае на Бабруйскую акругу — 751 чал.

Гэтыя лічбовыя даныя зьяўляюцца далёка няпоўнымі, паколькі значная колькасьць раёнаў яшчэ не прайшла чысткі.

Бязумоўна, што пры праверцы такое колькасьці працаўнікоў не абышлося і без непаразуменьняў, калі ў асобных выпадках вычышчалі і тых, хто гэтага не заслугоўваў. У якасьці прыкладу можна падаць вельмі цікавы выпадак, які меў месца ў Клімавіцкім раёне, Магілеўскае акругі, дзе ў якасьці вычышчанай зьявілася дзяўчына - сялянка, вылучаная на адказную работу ў якасьці старшыні РайКСТУ. Ня гледзячы на тое, што Клімавіцкаму РВК было добра вядома, што тав. Афанасьева, як ня досыць пісьменная, не магла ў першыя часы самастойна, без належнага кіраўніцтва і дапамогі, справіцца з выкананьнем адказнае работы, тым ня менш прэзыдыум РВК не падтрымаў яе. Камісія па чыстцы савецкага апарату па Клімавіцкім раёне, замест таго, каб дэтальна высьветліць адносіны работнікаў РВК да вылучэнкі, ступень дапамогі ёй у рабоце, уцягнуць яе ў працу па чыстцы апарату раённых і сельскіх устаноў, занялася высьвятленьнем, дый то павярхоўным, недахопаў у працы вылучэнкі Афанасьевай.

Можна было-б падаць і рад іншых прыкладаў нездавальняючага падыходу камісій да працаўнікоў. Акруговыя і цэнтральныя камісіі сваячасова выпраўлялі гэтыя недахопы.

Бядняцка - серадняцкія масы прынялі вельмі актыўны ўдзел у чыстцы. Сходы наведвалі па 200-400 чалавек; часта сядзелі да 1-2 гадз. ночы, шырока крытыкавалі ўсю работу нашых органаў на вёсцы, дэтальна абмяркоўвалі кожную кандыдатуру савецкага вясковага працаўніка.

Гэта актыўнасьць, зацікаўленасьць шырокіх колаў рабочых, батракоў, беднаты і сераднякоў да працы савецкага апарату дапамагла нам ачысьціць савецкі апарат ад тых, хто перашкаджае ажыцьцяўляць палітыку партыі і ўраду.

ХМЯЛЕЎСКІ.

Агляд грамадзкага харчаваньня

Да 29 сакавіка на ўсіх прадпрыемствах павінны быць арганізаваны аглядавыя камісіі і рабочыя брыгады

Пераключыцца на практычную работу

Ужо тыдзень, як па Менску разгарнулася шырокая падрыхтоўчая работа да агляду грамадзкага харчаваньня. Рад кіраўнічых арганізацый даў дырэктывы аб правядзеньні агляду на мясцох. (ЦК партыі, ЦСПСБ, Белкаапсаюз і інш). Прадпрыемствы. Цэнтральныя газэты («Савецкая Беларусь», «Рабочий», «Акцябр» і «Чырвоная Зьмена») уключыліся ў правядзеньне агляду і ўжо зьмясьцілі на сваіх старонках рад кіруючых і ўстанавачных матар'ялаў. ЦП Нархарч мабілізавала свой апарат і ўсю менскую сецьць саюзу на правядзеньне гэтай работы. Ужо арганізавана брыгада «Зьвязды» з рабкораў розных прадпрыемстваў.

Акруговыя газэты ў агляд ня ўключыліся. Толькі апошнімі днямі зьявіліся частковыя матар'ялы ў «Полесской Правде» і «Віцебскім Пралетарыі». Даныя мясцом дырэктывы ня выконваюцца, а калі выконваюцца, дык вельмі марудна. Не арганізавана праверка іх выкананьня і ёсьць небясьпека, што яны застануцца толькі **папяровымі** дырэктывамі.

Зараз мы робім пераключэньне на практычную работу па аглядзе. Да 29-га сакавіка на ўсіх прадпрыемствах ужо павінны быць арганізаваны аглядавыя камісіі і навербаваны кадры актывістых—брыгадзіраў і троек. Іх трэба адразу-ж кінуць на найбольш важныя аб'екты грамадзкага харчаваньня і ўсё выяўленае імі асьвятліць у прэсе.

У практычнай рабоце па аглядзе **на Менск робіцца такі ўпор,** каб ён быў прыкладам для ўсяе БССР. А таму ўсе ўдзельнікі агляду павінны гэта ўлічыць і адпаведна пабудаваць сваю практычную работу.

У СТАЛОЎЦЫ № 8 МЦРК

ЧАРГА ЗА МЕЙСЦАМ

«Полесская Правда» і «Віцебскі Пралетарый», як газэты буйных рабочых цэнтраў, па прыкладзе «Зьвязды», павінны ўзяць кіраўніцтва аглядам на сябе і не абмяжоўвацца кароткімі выпадковымі допісамі на гэту тэму, бяз сыстэмы, без кіраўніцтва ўсёй гэтай справай на прадпрыемствах.

Па меры разгортваньня практычнай работы па аглядзе, «Зьвязда» арганізуе аддзел «Вынікі агляду», дзе побач з інфармацыйнымі матар'яламі аб ходзе будуць дакладна асьвятляцца ўсе пытаньні паляпшэньня сыстэмы грамадзкага харчаваньня і спраўленьня недахопаў асобных сталовак.

У аддзеле «Вынікі агляду» заклікаюцца прымаць удзел усе арганізацыі, якія кіруюць грамадзкім харчаваньнем.

Нарада рабкораў „Зьвязды“—аб аглядзе

22-га сакавіка пры рэдакцыі газэты «Зьвязда» адбылася нарада па пытаньні агляду грамадзкага харчаваньня, на якой прысутнічала звыш 60 чал. — прадстаўнікі ад каапэрацыйных, прафэсыянальных арганізацый, рабкоры і члены рэдкалегій насьценгазэт.

З інфармацыйным дакладам выступіў прадстаўнік брыгады «Правда» **т. Аляксандроўскі,** які зазначыў, што агляд ва многіх мясцох яшчэ да гэтага часу не разгарнуўся. Ён заастрыў увагу на радзе задач, якія паўстаюць у сувязі з аглядам грамадзкага харчаваньня, перад друкам, партыйнымі, каапэрацыйнымі і грамадзкімі арганізацыямі.

Тав. **Сяргееў** далажыў аб пляне ўсебеларускай цэнтральнай камісіі па аглядзе грамадзкага харчаваньня і аб ходзе падрыхтоўкі да агляду.

Удзельнікі нарады адгукнуліся на заклік «Зьвязды»: па дакладах разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

— Кнігі скаргаў у сталоўках нічога не дапамагаюць, на скаргі адміністрацыя адказвае бюракратычна, кепская якасьць абедаў, у сталоўках патрэбна, каб прапановы рабочых аб паляпшэньні справы грамадзкага харчаваньня праводзіліся ў жыцьцё (т. Міхальцоў — БСІКА).

Тав. **Мірынгоф** зазначае, што справа з дзіцячым харчаваньнем зусім закінута, на гэту справу трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу.

— Ад добрай арганізацыі грамадзкага харчаваньня на вёсцы залежыць посьпех правядзеньня засеўнай кампаніі і правільная арганізацыя працы ў калгасах. **Трэба выконваць ранейшыя пастановы — арганізаваць на вёсцы 200 сталовак і 450 кухань** (т. Кірнос—Калгасцэнтр).

Тав. **Бязродны** (Эльвод) гаворыць, што каапэрацыя кепска забясьпечвае рабочых прадуктамі. **Рабочым увесь** абедзены перапынак прыходзіцца стаяць у чарзе. Тое самае гаворыць і тав. **Тасман** (ф-ка «Беларуска»).

Тав. **Крашынскі** адзначае, што на фабрыцы «Кастрычнік», **на якой налічваецца 1.600 рабочых, ёсьць толькі буфэт, а сталоўкі няма, трэба яе арганізаваць.**

Нарада пастанавіла арганізаваць на прадпрыемствах і ва ўстановах у пяцідзенны тэрмін аглядавыя камісіі, рабочыя брыгады і тройкі.

Нарада абвясьціла сябе ўдарнай і выбрала групу добраахвотнікаў-ударнікаў з 8-мі чал., як «брыгаду «Зьвязды».

БАЛАШКОЎ.

На мёртвым пункце

ВІЦЕБСК. (Наш. кар.) Акруговая камісія па правядзеньні агляду грамадзкага харчаваньня прыступіла ўжо да работы. Ёю даны належныя паказаньні мясцом, але, на жаль, гэтай кампаніі ў большасьці прадпрыемстваў і ўстаноў не аддаецца ніякай увагі.

Толькі рабкоры фанэрнага заводу паставілі пытаньне аб аглядзе на практычныя рэйкі. Адбыўся сход рабкораў і прафактыву, які ўзяў на сябе абавязак правесьці агляд грамадзкага харчаваньня па ўсёй Пралетарскай Слабадзе. На 24 сакавіка такія буйныя прадпрыемствы, як завод «Чырвоны Мэталісты», швэйная фабрыка «Прафінтэрн» і МББ чыгунка, яшчэ не стварылі камісій па аглядзе, не гаворачы аб практычнай рабоце.

Хто наступны

Цэнтральнае праўленьне саюзу нархарч абвяшчае сябе мабілізаваным для правядзеньня агляду грамадзкага харчаваньня і выклікае пасьледаваць яго прыкладу ўсе ЦП саюзаў.

Хто наступны?

Конкурс „Зьвязды“ на карэспандэнцыі аб лепшай і горшай сталоўцы

УМОВЫ КОНКУРСУ

Для правядзеньня абвешчанага «Зьвяздою» конкурсу на карэспандэнцыі аб лепшай і горшай сталоўцы, пры цэнтральнай аглядавай камісіі грамадзкага харчаваньня вызначана журы, якое складаецца з т. т. Сяргеява (рэд. «Зьвязда»), Адлерштэйна (ЦКБ РСІ), Мазалева (Белкаапсаюз), Васільева (ЦСПСБ) і Злотнікава (ЦП саюзу нархарч).

Да карэспандэнцый на конкурс прад'яўляюцца наступныя запатрабаваньні: кароткасьць, выразнасьць, ілюстрацыя фактамі. Карэспандэнцыя павінна паказаць, ці адпавядае даная сталовая ў сучаснай сыстэме грамадзкага харчаваньня тым патрабаваньням, якія прад'яўляюцца да грамадзкага харчаваньня ва ўмовах рэканструкцыйнага пэрыяду, ці дапамагае сыстэма яе абслугоўваньня павялічэньню рэальнай зарплаты рабочых, укараненьню грамадзкага харчаваньня ў рабочы быт, ці наадварот. У карэспандэнцыі павінна быць выразна выказана роля і кіраўніцтва вышэйшай кааперацыйнай арганізацыі.

У карэспандэнцыях аб горшай сталоўцы павінны быць асьветлены моманты: бюракратызму адміністрацыі, засьмечанасьці апарату чужым і непрыстасаваным элемэнтам, дарагоўля і кепская якасьць прадукцыі, галавацяпскі ўнутраны распарадак, у выніку якога адрываецца і губіцца рабочы час, стварающа вялікія чэргі, непрыстасаванасьць сталовае да абслугоўваньня прадпрыемства, і наогул спажыўца, антысанітарны стан, асноўныя прычыны незадаваленьня рабочага спажыўца і інш.

Аб лепшай сталоўцы — гібкасьць і прыстасаванасьць сталоўкі да хуткага і бесьперабойнага абслугоўваньня спажыўца, увязаная з вытворчым працэсам прадпрыемстваў. Процант рабочых і служачых прадпрыемства ці ўстановы, ахопленых грамадзкім харчаваньнем і як яно ўкараняецца ў быт, асабліва ў шматсямейных. Максымальнае зьніжэньне сабекошту і добрая якасьць прадукцыі, здаровы прытулак, добра пастаўлена гігіенічна-санітарная справа, чулы, працаздольны апарат і г. д.

Для прэміяваньня карэспандэнцый устанаўляецца 6 прэмій, з іх 3 прэміі за карэспандэнцыі аб лепшай сталоўцы і 3 — аб горшай.

Разьмеры прэмій: 2 першыя прэміі (за горшую і за лепшую) — па 300 руб., 2 другія прэміі — па 200 руб. і 2 трэція — па 100 руб.

Выплата прэмій праводзіцца цэнтральнай аглядавай камісіяй пры «Зьвязьдзе», паводле прысуду журы.

Усе карэспандэнцыі да конкурсу павінны быць за поўным і выразным подпісам, з азначэньнем месца службы, займаемай пасады і дакладнага адрасу. Прысылаюцца яны ў запячатаных канвэртах па адрасе: Менск, рэдакцыя «Зьвязды» «на конкурс па грамадзкім харчаваньні».

МЕНСК

Сьвяткаваньне дзесяцігодзьдзя вызваленьня БССР ад белапалякаў

Прэзыдыум ЦВК БССР прызнаў патрэбным правядзеньне шырокай палітычнай кампаніі, зьвязанай з 10-годзьдзем вызваленьня БССР ад белапалякаў. Для кіраўніцтва працай па падрыхтоўцы і правядзеньні сьвяткаваньня вызначана ўрадавая камісія пад старшынствам т. Хацкевіча, у складзе т. т. Саевіча, Канакоціна, Славінскага, Ашаровіча, Вансоўскага, Сэрбэнты, Платуна, Аксючыца, Шапавалава, Клімковіча, Буравой, Араныштама, Васілевіча і Палякова.

Камісіі запрапанавана распрацаваць плян сьвяткаваньня і падаць яго на зацьвярджэньне ў прэзыдыум ЦВК БССР.

Мэдычныя пункты на фабрыках і заводах

Адкрыты мэдычныя пункты на заводах «Кастрычнік», «Энэргія», «Бальшавік», «Камунар», «Пралетары», «Дрэваапрацоўшчык», шчотачнай фабрыцы. На трох прадпрыемствах арганізаваны пункты зубной дапамогі. Вызначана адкрыцьцё яшчэ такіх-жа пунктаў на торфараспрацоўках, усебеларускай выстаўцы і інш.

БДТ-2 распачаў сваю працу ў Менску

Пазаўчора БДТ-2 даў першы свой спэктакль у Менску. У сувязі з гэтым у будынку Белдзяржтэатру адбылося ўрачыстае пасяджэньне, на якім выступалі з прывітаньнямі прадстаўнікі АК КП(б)Б, НКА і ЦП саюзу працмастацтва. З дакладам аб шляхох разьвіцьця 2-га Беларускага Дзяржаўнага Тэатру выступіў дырэктар яго т. **Ліманоўскі.** Пасьля ўрачыстай часткі была пастаўлена п'еса «Разлом».

Выпуск курсаў камсамольцаў-палітасьветнікаў

Гэтымі днямі адбыўся выпуск камсамольцаў, якія скончылі двухтыднёвыя курсы палітасьветнікаў. Усяго курсы скончылі 41 чал., у тым ліку 9 жанчын. Усе камсамольцы, скончыўшыя гэтыя курсы, накіраваны на пастаянную работу ў калгасы.

Усе выпускнікі працавалі на прадпрыемствах і маюць вытворчы і камсамольскі стаж ад 3 да 9 год.

Канфэрэнцыя чытачоў часопісі „Красноармеец“

Пазаўчора скончылася Менская канфэрэнцыя чытачоў часопісі «Красноармеец и Краснофлотец». У працах канфэрэнцыі прымала ўдзел 120 дэлегатаў. З дакладам аб рабоце часопісі «Красноармеец и Краснофлотец» выступіў намесьнік рэдактара т. **Шчыпачоў.** Канфэрэнцыя паслала прывітальную тэлеграму рэдакцыі часопісі «Красноармеец и Краснофлотец» і бабруйскай канфэрэнцыі чытачоў гэтай часопісі, якая адкрылася ўчора.

Зьняты з работы дырэктар акулярнай фабрыкі

За безгаспадарчасьць, сувязь з прыватнікам і заціск самакрытыкі зьняты з работы дырэктар віцебскай акулярнай фабрыкі т. **Воўкаў.**

З сёнешняга дня МЦРК пачынае адпускаць пайшчыкам на даіцячыя кніжкі па 1 клгр. пшанічнай мукі і апэльсыны.

На 7-гадзінны рабочы дзень

Камісія ВСНГ БССР вынесла папярэднюю пастанову аб пераводзе на 7-мігадзінны рабочы дзень гут імя Домбаля, «Праца» і «Ноўкі» ў 1929-30 годзе, гут «Ільліч», «Пралетары» ў 1930-31 годзе, «Кастрычнік» — у 1931-32 г., запалкавых фабрык «Дняпро» і «Вэзувій» ў 1930-31 годзе, і фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» — у 1931-32 годзе.

ЦП саюзу хэмікаў прапанавала фабкомам абгаварыць на шырокіх вытворчых нарадах пытаньне аб падрыхтоўцы да пераходу прадпрыемстваў на 7-мігадзінны рабочы дзень.

Нарада па аглядзе грамадзкага харчаваньня

27 сакавіка, а 19 гадз., у памяшканьні ЦК ЛКСМБ склікаецца нарада па пытаньні аб удзеле камсамольскай арганізацыі ў аглядзе грамадзкага харчаваньня.

Парадак дня: Даклад прадстаўніка газ. «Правда» аб задачах агляду грамадзкага харчаваньня і ўдзеле камсамольскай арганізацыі. На нараду трэба зьявіцца прадстаўніком — Белрабсэкцыі, Белкаапсаюзу, Калгасцэнтру, МЦРК, саюзу нархарч, бюро камсамольскай ячэйкі нархарч, «Чырвонай Зьмены», «Юнг. Арбэйтэр», «Піянэр Беларусі», «Юнгер Ленінец», НК Асьветы, НК Аховы здароўя, акрінспэктарыяту асьветы, акрінспэктарыяту аховы здароўя, Белжылсаюзу, ЦСПСБ, калектыву ЛКСМБ зав. «Бальшавік», «Энэргіі», абутковай ф-кі і швэйнай ф-кі.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

БАН (Ленінская, 29/35). Агульны сход аб'яднан. жыльлёва-будаўнічага кааперацыйнага таварыства «Асьветнік-Камунар». Яўка членаў абавязкова. Запрашаюцца ўсе зацікаўленыя гэтаю справай. Пач. у 19 гадз.

Дом Асьветы. У 19 гадз. заняткі па літкурсаў для асьветнікаў.

У 20 гадз. 1-шы тур шахматнага турніру, заўтра ў 20 гадз. заняткі шахматнага гуртка.

Клюб навуковых працаўнікоў. У 19½ гадз. — пасяджэньне сацыяльна-бытавога сэктару ЦБ. Запрашаюцца: Шапіра М. Н., Гайвароўскі, Дворжац, Цітоў, Ліўшыц, Перабіла, Чарнышкова, Выдрын, Барычэўскі, Майзэль, Мялешка, Казак і Дружчыц.

ЦК МОПР'у БССР (Савецкая, 87). У 19 гадз. пасяджэньне прэзыдыуму ЦК, на якое павінны зьявіцца ўсе члены і кандыдаты прэзыдыуму, члены ЦК, што знаходзяцца ў Менску. Запрашаюцца члены і кандыдаты Мен. АК МОПР'у і РК, а таксама гарадзкі актыў МОПР'у.

Клюб навуковых працаўнікоў. У 20 гадз. агульны сход членаў клюбу. На парадку дня арганізацыйныя пытаньні. Яўка ўсіх членаў абавязкова.

Дзіцячая клініка. Агульны сход членаў сэкцыі ўнутраных хвароб навуковай асацыяцыі пры саюзе Мэдсанпрацы. Парадак дня: арганізацыя сэкцыі. Яўка для дактароў інтэрністых абавязкова.

У 18 гадз., ў памяшканьні рэдакцыі «Зьвязда» адбудзецца пасяджэньне цэнтральнай камісіі па аглядзе грамадзкага харчаваньня. Прысутнасьць наступных таварышоў абавязкова: Адлерштэйн, Кац, Мазэлеў, Мірынгоф, Васільлева, Вайнштэйн, Завусьцінскі («Камунар»), Шапашнікаў («Дрэваапрацоўшчык»), Аін («Бальшавік»), Пігулеўскі (гута «Пралетары»), Андронаў («Энэргія»), Бычкоўскі (ваг. майстэрні МББ).

Запрашаюцца прадстаўнікі газэт «Савецкая Беларусь», «Чырвоная Зьмена», «Акцябр».

Кастрычніцкі РК КП(б)Б прапануе зьявіцца ў РК у 20 гадз. наступным студэнтам праўгасу БДУ: Літвіну, Манько, Лічко, Лушчыцкаму, Кузьняцову, Герасімовічу, Шавру, Панкову, Вялуту, Роўкачу, Падуту, Красіку, Мільману, Давідовічу, Сарокіну, Шустэрману, Хомчанку, Сацынкевічу, Русецкаму, Шматкову і Шырко.

ЗАЎТРА

Дом Працасьветы. У 19 гадз. адбудзецца справаздачна-перавыбарчы сход парт'ячэйкі НКАсьветы. Парадак дня: справаздача бюро ячэйкі КП(б)Б і перавыбары.

Запрашаюцца супрацоўнікі НКА, Белдзяржбібліятэкі, мясцовага транспарту камсамольскай ячэйкі дашкольнага і фізкультурнага тэхнікумаў і ўсе асьветнікі гор. Менску.

Агульны адкрыты сход парткалектыву БДУ у 18 гадзін у актавай залі БДУ. На сход запрашаюцца камсамольцы і беспартыйнае студэнцтва. Парадак дня: справаздача бюро парткалектыву і перавыбары.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Табліца 6-га тыража выйгрышаў

2-й пазыкі Індустрыялізацыі

па процантна-выйгрышным выпуску

№№ выйгр. сэрый.	№№ абліг.	Сума выйгр.	№№ выйгр. сэрый.	№№ абліг.	Сума выйгр.	№№ выйгр. сэрый.	№№ абліг.	Сума выйгр.	№№ выйгр. сэрый.	№№ абліг.	Сума выйгр.
00004	1—25	100	15662	1—25	100	33558	1—25	100	55561	22*)	1000
00305	1—25	100	15684	1—25	100	34109	1—25	100	55660	1—25	100
00486	1—25	100	15742	1—25	100	34252	1—25	100	55842	1—25	100
00518	1—25	100	15743	1—25	100	34324	1—25	100	55855	1—25	100
00925	1—25	100	15783	06*)	1000	34519	1—25	100	56563	1—25	100
01173	01*)	1000	16109	1—25	100	34743	1—25	100	57208	1—25	100
01295	1—25	100	16223	1—25	100	34818	1—25	100	57382	1—25	100
01356	1—25	100	16529	1—25	100	35161	1—25	250	57653	1—25	100
01423	1—25	100	17064	1—25	100	35519	1—25	100	60060	1—25	100
01450	1—25	100	17527	1—25	100	36058	1—25	100	60267	1—25	100
01556	1—25	100	17644	1—25	100	36095	1—25	100	61220	22*)	1000
01655	1—25	100	17852	16*)	1000	36412	1—25	100	61520	1—25	100
01749	1—25	100	18372	1—25	100	36671	1—25	100	61549	1—25	100
02180	1—25	250	18908	1—25	100	37101	1—25	100	61905	1—25	100
02194	1—25	100	19127	1—25	100	37621	1—25	100	62115	1—25	100
02755	1—25	100	19162	1—25	100	38561	1—25	100	62666	1—25	100
02801	1—25	100	19587	1—25	250	38776	1—25	100	63995	1—25	100
02849	1—25	100	19716	1—25	100	39361	1—25	100	64362	1—25	100
03356	15*)	1000	19805	1—25	100	39372	1—25	100	64389	1—25	100
03502	1—25	100	19902	1—25	100	39683	1—25	100	64667	1—25	100
04402	1—25	100	20039	1—25	100	40254	1—25	100	64926	1—25	100
04587	1—25	100	20610	1—25	100	40570	1—25	100	65022	1—25	250
04663	1—25	100	20706	1—25	100	41557	1—25	100	65153	1—25	100
05141	1—25	100	20801	1—25	100	41822	1—25	100	65155	1—25	100
05469	1—25	100	20830	1—25	100	42545	1—25	100	65543	1—25	100
05888	19*)	1000	20924	04*)	1000	44472	1—25	100	65607	1—25	100
06104	1—25	100	22495	1—25	100	45105	1—25	100	65697	13*)	1000
06234	1—25	100	22777	1—25	100	45124	1—25	100	65743	1—25	100
06531	1—25	100	22860	1—25	100	45514	1—25	100	65929	03*)	1000
07060	1—25	100	23285	1—25	100	45734	1—25	100	66606	17*)	1000
07261	1—25	100	23641	1—25	100	46351	1—25	100	67280	1—25	100
07512	1—25	100	23699	1—25	100	46544	1—25	100	67307	1—25	100
07589	1—25	100	24434	1—25	100	[illegible]	1—25	100	67433	1—25	100
07918	1—25	100	25409	01*)	1000	46569	01*)	1000	68940	1—25	100
08058	1—25	100	25438	1—25	100	47949	1—25	100	69617	1—25	100
08089	1—25	100	25784	1—25	100	47977	1—25	250	69716	1—25	100
08769	1—25	100	25929	1—25	100	48664	1—25	100	70067	1—25	100
08920	20*)	1000	26252	1—25	100	49279	1—25	100	70471	1—25	100
09477	1—25	100	26492	1—25	100	49576	1—25		70072	1—25	100
09807	23*)	1000	26674	1—25	100	49697	1—25	100	71218	1—25	100
10772	1—25	100	26750	1—25	100	50374	1—25	100	71332	1—25	100
11091	1—25	100	26797	1—25	100	50649	1—25	100	71666	1—25	100
11389	1—25	100	26827	1—25	100	51172	1—25	100	71720	1—25	100
11645	1—25	100	27657	1—25	100	51222	1—25	100	72288	1—25	100
12095	1—25	100	29067	1—25	100	51329	1—25	100	72544	1—25	100
12458	1—25	100	30131	1—25	100	51331	1—25	100	72742	1—25	100
12759	1—25	100	30484	1—25	100	51595	1—25	100	72876	1—25	100
13360	1—25	100	30519	1—25	100	51827	1—25	250	73935	1—25	100
13712	19*)	1000	30922	11*)	1000	52065	1—25	100	74424	14*)	1000
14069	1—25	100	31403	1—25	100	52833	1—25	100	75251	1—25	100
14292	1—25	100	31690	1—25	100	53174	1—25	100	75287	1—25	100
14853	1—25	100	32010	1—25	100	53266	1—25	100	76019	1—25	100
15058	1—25	100	32130	1—25	100	53270	1—25	100	76339	1—25	100
15135	1—25	100	32199	1—25	100	53709	19*)	1000	77589	1—25	100
15190	1—25	100	32686	1—25	100	53720	1—25	100	78119	23*)	1000
15583	1—25	100	33275	1—25	100	54147	1—25	100	78470	1—25	100
15584	1—25	100	33464	22*)	5000	54601	1—25	100	79195	1—25	100
						55031	1—25	100	79535	1—25	100
						55259	1—25	100			

*) Астатнія 24 аблігацыі гэтай сэрыі выйгралі па 100 руб.

З лістоў рабселькораў

ЧАМУ САРВАЛІСЯ ЗАНЯТКІ НА КУРСАХ

У пачатку навучальнага году сіламі студэнцкіх арганізацый БДУ пры швэйнай фабрыцы «Кастрычнік» былі арганізаваны аднагадовыя і двухгадовыя курсы для падрыхтоўкі рабочых у ВТНУ. Фабком і бюро парткалектыву своечасова не зацікавіліся пытаньнем стварэньня добрых умоў для работы гэтых курсаў. У выніку чаго зараз з 65 слухачоў засталося 20. Гэты адсеў у асноўным быў выкліканы тым, што курсантаў своечасова не разгрузілі ад усіх грамадзкіх работ. Заняткі ў першым паўгодзьдзі адбываліся пры поўнай адсутнасьці навучальных падручнікаў, адсюль сыстэматычна павялічваўся процант акадэмічнай непасьпяховасьці, што прымусіла 60 рабочых і работніц пакінуць курсы. Кіраўнічыя фабрычныя арганізацыі ня выконваюць пастаноў Саўнаркому СССР аб прадастаўленьні ільгот для рабочых, якія займаюцца на курсах па падрыхтоўцы ў ВНУ і ВТНУ.

Аб усіх гэтых ненармальнасьцях своечасова паведамляліся кіруючыя арганізацыі фабрыкі, але ніхто не зьвярнуў увагі.

Цэнцыпэр.

Забараніць зьнішчэньне маладняка

Смалявіцкая спажывецкая кааперацыя і раймалжывёласаюз пры загатоўцы жывёлы на мяса адбіраюць шмат маладняка, які забаронена аддаваць на убой, а трэба накіроўваць у калгасы і саўгасы для гадоўлі. Між тым, як гэта ня дзіўна, кіраўнікі калгасаў і саўгасаў, ня гледзячы на рад прапаноў, адмаўляюцца прымаць да сябе гэту жывёлу, заяўляючы, што ў саўгасах і калгасах свайго маладняка хапае. Такое ненармальнае становішча стварылася асабліва ў апошні час, у выніку чаго шмат цялят-сысуноў знаходзіцца на загатоўчых пунктах бяз догляду і корму і толькі праз пекаторы час іх сілком удаецца здаць у які-небудзь калгас.

Цікава адзначыць, што пра ўсе гэтыя ненармальнасьці ведае Смалявіцкі РВК, але да гэтага часу ён ня прыняў ніякіх канкрэтных захадаў. Вінаваты таксама і раймалжывёлсаюз, які не вядзе растлумачальнай працы ў калгасах наконт гэтага пытаньня.

В. Л.

Рашуча змагацца з кулацкай агітацыяй

У Мазалаўскім сельсавеце (Амсьціслаўскі раён) кулакі павялі ўзмоцненую агітацыю супроць калгасу «Чырвоны Дзень», які аб'ядналася з калгасам «Шлях Ільліча».

Кулацтва пачало падбухторваць беднякоў і серадлякоў выпісвацца з калгасаў. Ня гледзячы на тое, што праўленьне калгасу і сельсавет паведамлялі аб гэтым ненармальным зьявішчы ў РВК, апошні не дае ніякіх канкрэтных прапаноў наконт далейшай працы калгасу. Бедпякі і перадавыя серадлякі, якія засталіся ў калгасе, патрабуюць прыняць самыя рашучыя меры супроць кулацкіх агітатараў, якія паставілі перад сабою мэту разбурыць арганізаваны калгас.

ЦІТОЎ.

ЗРЫВАЕЦЦА КАШТОЎНАЕ МЕРАПРЫЕМСТВА

Паводле дагавору паміж Менскім палітэхнікумам і НКЗ, студэнты тэхнікуму заняліся складаньнем вытворчых гідра-тэхнічных праектаў для розных акруг Беларусі. Гэтая праца вельмі каштоўна. Студэнты замяняюць НКЗ 25 недастаючых гідра-тэхнічных праектавальнікаў. Але гэтаму добраму мерапрыемству перашкаджае Менскі акруговы гідра-тэхнік Александровіч. Замест трох гідра-тэхнікаў, якія павінны кіраваць гэтаю працаю, Александровіч вызначыў толькі 2-х, а трэцяга, ня гледзячы на прапанову НКЗБ, не адпускае. Бюракратычныя адносіны Александровіча да такое важнае справы могуць сарваць своечасовае заканчэньне вытворчых праектаў, а таксама своечасовы выпуск з палітэхнікуму 29 гідра-тэхнікаў-студэнтаў, якія зараз заняты на працы па складаньні гэтых праектаў.

Студэнты.

Сёньня ў клюбе імя Леніна (б. Чырвоная заля) адбудзецца даклад тав. Мэйлаха Эпштэйна — рэдактара яўрэйскай амэрыканскай камуністычнай прэсы «Моргн Фрайгайт» — на тэму «Аб крызісе ў Амэрыцы і рэвалюцыянізаваньні рабочае клясы ў Амэрыцы». Пач. у 20 гадз. Білеты на прадпрыемствах і ў канцылярыі клюбу.

Сёньня, 25-га сакавіка, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні Дому Працы, 2-гі паверх, пакой № 10, адбудзецца

агульна-гарадзкі сход ІТР,

на якім прафэсар КРАЎЗ зробіць даклад «аб навейшых дасягненьнях у галіне прамысловай вэнтыляцыі».

Запрашаюцца ўсе інж.-тэх. работнікі гор. Менску і заводскія камісіі па ахове працы.

ПРЭЗЫДЫУМ Бел. МБІТ.

14.000 ПАДПІСЧЫКАЎ на „ЗЬВЯЗДУ“ па МЕНСКАЙ акрузе на КРАСАВІК м-ц 1930 год.

На сакавік месяц падпіска па акрузе складае 11.000 экз.

РАЙКОМЫ, ПАРТ'ЯЧЭЙКІ і ЎПОЎНАВАЖАНЫЯ!

ЗАРАЗ-ЖА РАЗГАРНЕЦЕ РАБОТУ па вярбоўцы новых кадраў ПАДПІСЧЫКАЎ

Канкрэтнымі, сапраўднымі мерапрыемствамі па пашырэньні „ЗЬВЯЗДЫ“ ВЫКАНАЕМ гэту лічбу.

НІ АДНАГО партыйца і беспартыйнага актывістага БЕЗ „ЗЬВЯЗДЫ“

ВЫШЛІ З ДРУКУ І ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ — БІБЛІЯТЭКА КАЛГАСЬНІКА

Я. ЧАЛЯДЗІНСКІ. БАРАЦЬБА ЗА КАЛГАСЫ. Нарыс аб калектывізацыі І.Ліманшчыны. Стар. 95. Цана 20 к.

А. СОКАЛАЎ. Камуна Колас. Стар. 82. Цана 20 к.

Б. БАРАТАЎ. Калгас „Чырвоная Зорка“. Стар. 35. Цана 10 к.

С. МАРГЕЛАЎ. Калгасы-адзіны шлях сялянства. Стар. 54. Цана 15 к.

Заказы накіроўваць: МЕНСК, БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА, КНІГА-ПОШТАЙ

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР. Сэзон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску. Аўторак, 25 сакавіка. Для СТУДЭНЦТВА. РАЗЛОМ. Б. Лаўрэнеў. П'еса ў 4 дзеях. Пачатак роўна а 8 гадз.

ЮДА | ЮДА | ЮДА

Кіно-тэатр Культура: Толькі 3 дні 24, 25 і 26 сакавіка. ХАЦІНА ДЗЯДЗЬКІ ТОМА кіно-п'еса ў 6 част. Звыш праграмы ДАГЭСТАН культур-фільм у 2-х част. Дзенныя сэансы: а 1 г. дня і 3 г. 15 м. Вячэрнія сэансы: а 7 г., 8 г. 30 м. і 10 г. 30 м. Каса ад 5 г. увеч.

Кіно Інтэрнацыянал: Грандыёзны фільм вытворчасьці ф-кі культур ільм «СОЎКІНО» ГІГАНТ. Звыш праграмы Амэрыканская камэдыя у 2-х частк. Дзенныя сэансы: а 1 г. 30 м. і 3 гадз. Каса—ад 12 гадз. дня.

Кіно Пралетары: Амэрыканск. фільм вытв. «Парамоўнт-фільм» У ДОКАХ НЬЮ-ЁРКУ драма ў 8 частках. Рэжысэр Джозэф Штэрнбэрг. Штодзенна 4 сэансы: а 5 гадз. 45 м., 7 г. 25 м., 9 г. 05 м. і 10 гадз. 45 м. Каса адкрыта ад 4 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр“: Палітасьветфільм БАЙКАЛ у 6-ці частках. Звыш праграмы ВОЛХАЎБУД у 1-й част. Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз., 2-га—3 г. 30 м. Каса адчынена ад 11 г. 30 м.

Кіно Спартак: Звыш праграмы гастролі гумарыстага-сатырыка Пятра САКОЛЬСКАГА. На экране мастацкі фільм ПУРГА драма ў 7 ч. Пачатак 1 с. а 7 г. Каса—ад 5 г. 30 м.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на 1930 год на штомесячную літаратурна-мастацкую і грамадзка-палітычную часопісь „МАЛАДНЯК“ орган Беларускай Асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў.

Вышаў з друку, паступіў у продаж і рассылаецца падпісчыкам „МАЛАДНЯК“ № 2.

ЗЬМЕСТ:

П. Галавач. Вінаваты (аповесьць, працяг).
С. Шушкевіч. Зноў стрэлка верпецца.
І. Гурскі. Качагары (драма, працяг).
М. Хведаровіч. 25 дзён дажджу ня было (верш).
Алесь Вайноўскі. Сьмерць рабочага Шварца (апавяданьне).
С. Хурсік. Чорны мост (аповесьць, канец).
К. Губарэвіч. Гайка (апавяданьне).
Ю. Таўбін. Лірычнае хваляваньне (нізка вершаў).
Тры вершы. Пушкіна (пераклад з расейскае Ю. Гаўрука).
НА ВЯЛІКАЙ БУДОЎЛІ
Іл. Барашка. Нарысы з фронту калектывізацыі.
С. Хурсік. Прэч з дарогі.
ТЭАТР
Я. Ліманоўскі. Задачы і пэрспэктывы БДТ2.
К. Губарэвіч. Аб «высокай культуры».
КІНО
А. Некрашэвіч. Беларускае кіно.
БЛЕКНОТ ПІСЬМЕНЬНІКА
Барыс Мікуліч. Бабруйшчына рапартуе.
БІБЛІЯГРАФІЯ
Н. Кабакоў. «Полымя» Лістапад-сьнежань.
С. К. Ян Скрыган «Затока ў бурах».
Ага. Пякельная кніжка.
Барыс Мікуліч. Беларускія пісьменьнікі па расейскай мове.
Б. М. «Рост».
ГУМАР
Шаржы Розанава. Тэкст Вяземскага.
ХРОНІКА
Хроніка.
Альфабэтны паказальнік «Маладняк» за 1923-29 г.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На год.	На 6 м.	На 3 м.	На 1 м.
3 руб.	1 р. 60 к.	80 к.	30 к.

Сьпяшайцеся з падпіскай.

Падпіска прымаецца: ва ўсіх паштовых аддзяленьнях, агэнцтвах, ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва і спэцыяльнымі ўпаўнаважанымі выд. «Чырвоная Зьмена».

АБВЕСТКА

МЕНСКАЯ АКРУГОВАЯ КАНТОРА СУВЯЗІ

даводзіць да ведама, што, пачынаючы з 1 красавіка г. г., на аснове пастановы РСІ БССР, зацьверджанай СНК БССР (4/III—1930 г. прат № 40),

уся пісьмовая карэспандэнцыя, газэты і пасылкі на імя дзяржаўных і гаспадарчых устаноў, фабрык і заводаў у абавязковым парадку БУДЗЕ ДАСТАЎЛЯЦЦА штодзенна, паміж 9-11 і 14-16 гадзінамі і ў гэтыя тэрміны забірацца ад іх мясцовая карэспандэнцыя для дастаўкі па горадзе і іншагародняя для адсылкі па прызначэньню, БЕЗ НАКЛЕІКІ ПАШТОВЫХ МАРАК.

Для афармленьня абмену пошт, заключэньня дагавору і забесьпячэньня бланкамі для здачы пошт, просьба камандыраваць прадстаўніка з поўнамоцтвам.

Час. вык. аб. загадчыка канторы Калечыц

Згубленыя і ўкрадзеныя наступныя дакуманты лічыць несапраўднымі:

Чырвонаарм. кн. Шчаграцова І, выд. сап. ротай 37 дыв. 7-1
Паявая кн. ТПО ст. Ворша № 21459 Дудзіна С. М. 7-2
Хлебн. кн. Песьліна М. Е., выд. ЦРК г. Воршы. 7-3
Паявая кн. Зайцавай А. Л., выд. ТПО ст. Ворша за № 24518. 7-4
Чырвонаарм. кн. Харашчука І. І., выд. Горацк. ваенкаматам. 7-5
Чл. паявая кн. № 4742 Белус Ф. Ф., выд. ТПО ст. Ворша. 7-6
Паявая кн. № 33516 Клюйко І. Н., выд Аршанск. ТПО. 7-7
Вайск. кн. № 351 Міхайлава М. М., выд. Аршанск. РВК. 7-8
Асабов. пасьведч № 10-п Наталевіча Я. Д., выд. сл. экспл. ст. Ворша. 7-9
Паявая кн. № 4912 Жураўскага М. А., выд. Аршанск. ЦРК. 7-10
Вайск. біл. Юсічава І. С., выд. Аршанск. ваенкаматам. 7-11
2 паявыя кн. №№ 14797 і 24076, выд. Аршанск. ТПО, пашпарт, выд. Любавіц. РВК на імя Пушкіна Я. 7-12
Чл. біл. саюзу чыгуначнікаў № 69319 Бібікава А. П., выд. вуч. к-там № 3 ст. Ворша. 7-13
Чл. біл. саюзу чыгуначнікаў Дайнеко Д., выд. м-к № 12 ст. Ворша 7-14
Канд. картка № 29655 Кронік І. М., выд. Аршанск. акруткомам КП(б)Б 7-15
Паявая кн. № 7958 Майстрэнкава П., выд. Аршанск. ТПО. 7-16
Адрэзак «В» Трусава В. М., выд. ПЧЗ ст. Ворша. 7-18
Вуч.-конск. кн. Волкава А., выд. Аршанск. акрваенкаматам. 7-19
Асабов. пасьведч. № 170-к Каменскай М. І., выд. ДН2 ст. Ворша. 7-20
Асабов. пасьведч. № 102-с Саўчэнка М., выд. адда. цягі Ворша. 7-20
Асабов. пасьведч. № 1-10 Юр'ева Г., выд. III вуч. сл. цягі 7-22
Паявая кн № 28042 Шаркоўскага А., выд. Аршанск. ТПО. 7-23
Наб. кн. ТПО ст. Ворша МББ. ч. за № 293 Фелзюк С. 7-24

Асоб, якія ведаюць месцазнаходжаньне гр. Гвазьдзёва Мікалая Барысава, просьба паведаміць па адрасе: БССР, Мазырская акруга, Нараўлянскі раён, Галоўчыцкаму с/с. для Гвазьдзёвай К. В.

Шукаю мужа Еўстафія Адамавага Кірпічэнкава. Прашу асоб, якія ведаюць яго месцазнаходжаньне, паведаміць па адрасе: пошта Чавусы, Магілеўскай акругі, с. Жэлівс, Юстыне Фамінічне Кірпічэнкавай.

Палтарацкі Антось абвяшчае аб скасаваньні шлюбу з гр. Палтарацкай Вольгай Сямёнавай, Раскаселязьнеўскага с/с., Кохапаўскага р-ну, Аршанскай акругі.

Працаваў рытульным разьніком у Менскай гарадзкай разьніцы. Абвяшчаю, што адмаўляюся ад рэзкі жывёлы і хатніх птушак.

Астрамецкі Янкель.

Майстар збруі Ждановіч І. В. просіць гр. Лобача Г. Г. забраць сваю стрэльбу, зданую ў рамонт у кастрычніку 1929 г. Праз месяц, калі ўласьнік ня зьвіцца, стрэльба будзе прадана.

Ждановіч І. В.

Пасьведч. Янушкевіч А. Е., выд. Лепельск. райміліцыяй за № 2389 8
Паявая кн. № 409 Хаткевіча Н. С., выд. Каменск. спаж.-т-вам. 9
Вуч.-конск. кн. № 3948 Гаўрука Ц., выд. Бягомльск. РВК 10
Паявая кн. № 673 Докшынскага Е. Н., выд. Барысаўск. спаж. г-вам. 11
Каап. кн. Гарэліка І., выд. Пухавіцк. спаж.-т-вам. 12
Чл. паявая кн. № 851 Шэмнеля П. М., выд. Клясьціцк. спаж. т-вам. 13
Чл. паявая кн. Ушакова Р. І., выд. Клясьціцк. спаж.-т-вам за № 442 14
Чл. біл. саюзу хэмікаў Месровіча А. С., выд. заўкомам зав. «Домбаль» за № 251639 15
Чл. кн. № 108/300 Кердом М. Т., выд. саюзам РКГ г. Барысава. 16
Пашпарт Рыўліпай Р. Ф., выд. Тураўск. РВК за № 1600 17
Вуч.-конск. карт. № 3089 Еўфіменка П. 18